ГРАШОВЫЯ ПАЗЫКІ ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

4

КРОКІ ДА РАДЫЕБЯСПЕКІ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 КРАСАВІКА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 80 (29194)

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Вадзім ДЗЯМКО, начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды:

«Штогод пасля святаў з могілак на палігоны цвёрдых камунальных адходаў вывозяць каля мільёна пластыкавых кветак. Тэрмін іх раскладання — ад 100 да 500 гадоў. Другаснай апрацоўцы яны не падлягаюць. Альтэрнатывай ім павінны стаць жывыя кветкі ў вазонах, высаджаныя ў грунт мнагалетнікі, карлікавыя хмызнякі, газонная трава, свечкі, стужкі з тканіны».

КАРАТКА

- **Больш чым Br500 тысяч пералічана ў прафсаюзны фонд страхавання медыкаў. Ён фарміруецца за кошт салідарных адлічэнняў усіх галіновых прафсаюзаў і добраахвотных ахвяраванняў грамадзян.**
- Наведаць могілкі ў зоне адчужэння без прапускаў можна будзе 25—28 красавіка
- **Навучальныя заняткі ў школах Беларусі перанесены з 27 на 25 красавіка.**
- Прафсаюзы на суботніку прывядуць у парадак месцы баявой славы.
- **Беларускі гатунак бульбы з фіялетавай мякаццю адправяць на дзяржвыпрабаванні да канца 2020 года.**
- Мінсельгасхарч: запасаў агародніны ў сховішчах у 3 разы больш, чым летась.

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ТРЭБА АПЕРАТЫЎНА ПРЫМАЦЬ РАШЭННІ ПА ТЫХ ПЫТАННЯХ, ЯКІЯ СЁННЯ ВОСТРА ПАЎСТАЮЦЬ ПЕРАД НАМІ»

Фота БелТА.

На нарадзе ў Палацы Незалежнасці гаварылі пра самае важнае на сёння для дзяржавы і для людзей

Пра тое, што ў чацвер у кіраўніка дзяржавы адбудзецца сур'ёзная размова, падказвалі і аб'ектыўная рэчаіснасць, і здагадкі журналістаў пула. Прафесійнае чуццё не падвяло: на чарговую нараду запрасілі кіраўніцтва ўрада, губернатараў, вайскоўцаў, памочнікаў Прэзідэнта — усяго больш за 40 чалавек. Тэма сустрэчы па размаху не саступае колькасці прысутных — першачарговыя меры па забеспячэнні работы эканомікі і сацыяльнай сферы Рэспублікі Беларусь ва ўмовах сусветнай эпідэміялагічнай сітуацыі. Калі прасцей, гаварылі пра захворванні, прамысловасць, адукацыю, дабрабыт людзей і межы, якія нечакана з'явіліся не толькі на карце, але і ў разуменні партнёраў. Але, каб пры сённяшняй сітуацыі знайсці баланс і прыйсці да паразумення, у гэтых і іншых сферах ад усіх патрабуецца адказнасць, дысцыпліна, самаадданасць і стараннасць. Гэта заклік на адрас і ўлады, і кожнага беларуса. «Нам трэба аператыўна прымаць рашэнні па тых пытаннях, якія сёння востра паўстаюць перад намі», — заклікаў Прэзідэнт удзельнікаў нарады.

СТАР. 2

Бацькава навука

Жыхар гарадскога пасёлка Ушачы Генадзь КАРЭЙША настолькі моцна палюбіў і асвоіў кавальскае рамяство, што абсталяваў уласную кузню і робіць неабходныя сабе і людзям рэчы. Сын Ігар, які жыве ў Віцебску, часта наведвае малую радзіму, дапамагае бацьку-кавалю, становіцца малатабойцам і тым самым спасцігае сакрэты кавальскай справы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Спецыяльны рэпартаж

МАСКА, ПАЛЬЧАТКІ І ДЫСТАНЦЫЯ

Калі правіла гігіены сталі клопатам аб блізкіх

Рэстаран хуткага харчавання забіты людзьмі, наколькі гэта магчыма. Маладая пара вачыма шукае свабодны столік. Знаходзіць і ў імгненне займае месца. Сцягваюць маскі на падбародак, усміхаюцца адно аднаму. Дзяўчына скідае далонню крошкі са стала, а мужчына накіроўваецца рабіць заказ. Я села за столік каля выхаду, таму што месцаў больш не было. Назіраю, як кур'ер без маскі і пальчатак забірае заказ і стомленай хадой накіроўваецца да выхаду. Здаецца, што ў дзевяць вечара работнікам гэтага кафэ проста не да бяспекі наведвальнікаў, як, зрэшты, і самім наведвальнікам. За сорак хвілін, што я там знаходзілася, так ніхто і не выйшаў працерці мой столік, ні адзін наведвальнік так і не падышоў да дазатара з антысептыкам, ніхто не вытрымліваў дыстанцыю ў паўтара метра, хаця супрацоўнікі і наляпілі пазнакі на падлогу, якія нагадваюць пра гэта...

Яшчэ сёмага красавіка Мінгарвыканкамам быў зацверджаны план дадатковых мерапрыемстваў па прафілактыцы і зніжэнні распаўсюджвання рэспіраторных інфекцый, у тым ліку выкліканых COVID-19. У плане 25 рэкамендацый для розных арганізацый усіх формаў уласнасці, па сутнасці, яны нагадваюць элементарныя правілы гігіены, якія павінны выконвацца не толькі падчас пандэміі. Так, ёсць сярод іх і парады, якія могуць знізіць колькасць наведвальнікаў, але менавіта цяпер іх проста трэба выконваць. Напрыклад, неабходнасць трымаць дыстанцыю. Хоць кіраўніцтва рэстарана, які я наведала, і прыбрала з залы некаторыя столікі, але з-за вялікай колькасці людзей я не адчула дыстанцыі.

СТАР. 4

«ТРЭБА АПЕРАТЫЎНА ПРЫМАЦЬ РАШЭННІ ПА ТЫХ ПЫТАННЯХ, ЯКІЯ СЁННЯ ВОСТРА ПАЎСТАЮЦЬ ПЕРАД НАМІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«За чатыры месяцы свет змяніўся да непазнавальнасці. Ці тое яшчэ будзе... Саюзнікі, якія дзесяцігоддзямі адкрывалі межы, устанаўлівалі добрыя адносіны паміж сабой, гэтыя межы аднавілі за адзін дзень і разбурылі адносіны. Гэта датычыцца ўсяго свету», — сказаў Прэзідэнт і працягнуў, што на дадзены момант уся сусветная эканоміка знаходзіцца пад ціскам яшчэ нікім не вырашанай праблемы, так званай пандэміі.

Яна закранае і нашу экспартнаарыентаваную краіну, якая не можа цалкам ізалявацца ад уплыву тых працэсаў, што адбываюцца на планеце, не можа скараціць негатыўнае ўздзеянне на эканоміку і звыклы жыццёвы ўклад.

Фота БелТА.

Прыслухоўваемся, але маем свой вопыт

Для барацьбы з новай інфекцыяй краіна задзейнічала ўсе неабходныя рэсурсы і рэагуе адэкватна, без надзвычайшчыны і празмернасці. Як расказаў Аляксандр Лукашэнка, ***генеральны дырэктар Сусветнай арганізацыі аховы здароўя напярэдадні нарады даслаў яму пісьмо, у якім падзякаваў за прынятыя меры і парэкамендаваў яшчэ некаторыя.*** «Але мы, мабыць, з вамі лепш ведаем, што рабіць у нашай краіне. Тым не менш прыслухоўваемся да парад спецыялістаў. Мы значна больш (і гэта адзначае СААЗ) пачалі тэсціраваць наша насельніцтва», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. На яго думку, ***галоўнае — не толькі аб'ёмы тэсціравання і колькасць выяўленых хворых на каранавірус, але і захаванне прымальнай загрузкі на сістэму аховы здароўя, каб яна не абвалілася як у іншых краінах.***

«Пакуль у нас гэта атрымліваецца. І дай Бог нам прайсці такімі тэмпамі, выйсці, як спецыялісты кажуць, на гэта плато і звалiцца ўніз па захваральнасці нашага насельніцтва», — сказаў Прэзідэнт, звярнуўшы асаблівую ўвагу на хворых на пнеўманію, на лячэнні якіх медыкам неабходна сканцэнтраваць намаганні. Пры гэтым не забываюцца і пра іншых пацыентаў: астматыкаў, сардэчнікаў, анкалагічна хворых.

Меры, якія прапанаваны СААЗ, Прэзідэнт дае загад вывучыць. «Але калі яны прапануюць амаль да каменданцкага часу ўвесці, слухайце, я яшчэ раз падкрэсліваю, ***неабходна — увядзём і каменданцкі час. Трэба — ізалюем гарады, пасёлкі і вёскі. Але ці сёння стаіць такая праблема перад краінай? Не. Таму мы не адмахваемся ад рэкамендацый, але павінны зыходзіць з комплексу рэкамендацый і нашага вопыту і дзейнічаць адпаведна»,*** — працягнуў Прэзідэнт.

На яго думку, нельга трымаць у бальніцах здаровых людзей, таму была прынята наступная сістэма. Калі чалавек на апошняй стадыі выздараўлення, яго перамяшчаюць у санаторый, дзе ён далечваецца. «І сёння мне яшчэ не адзін урач не сказаў, што гэта было няправільнае рашэнне. Амбулаторнае лячэнне дае выдатны вынік у плане разгрузкі нашай сістэмы аховы здароўя. І, што самае важнае, — урачоў», — канстатаваў кіраўнік краіны.

Ён прывёў факт, што больш за ўсіх хварэе і надае праблем Мінск. Нядзіўна: самы буйны горад. Але Прэзідэнт упэўнены, што Беларусь справіцца з гэтай праблемай, якая ўсё больш палітызуецца.

Урокі на будучыню

Наступная тэма, якую закрануў Аляксандр Лукашэнка, — паляпшэнне барацьбы з інфекцыйнымі захворваннямі. ***Пасля заканчэння пандэміі на вірусалогію, эпідэміялогію, мікрабіялогію і іншыя падобныя сферы медыцыны звернуць асаблівую ўвагу. «Нельга з імі працаваць па рэшткавым прынцыпе.*** Свет будзе пастаянна хварэць на гэтыя заразы, — сказаў Прэзідэнт, згадаўшы птушыны грып, афрыканскую Эболу. — Мы заўсёды будзем у гэтым цесным свеце сутыкацца з такімі віруснымі захворваннямі, і сістэму гэтую неабходна ўмацоўваць. Гэта адзін з урокаў».

Прэзідэнт даў загад разабрацца, як лечаць людзей з пункту гледжання бяспекі медыцынскага персаналу. «Не павінна быць расхлябанасці — сабярыцеся там, дзе трэба сабрацца», — заклікаў кіраўнік дзяржавы. Разам з тым ён выказаў неўразуменне, калі людзі бягуць ад тых, хто перахварэў на каранавірус. А гэтыя людзі мала таго, што бяспечныя для навакольных, яны, па словах кіраўніка дзяржавы, «наш залаты фонд». У гэтых людзей бяруць кроў і робяць плазму для лячэння іншых. Метад праверaны на эфектыўнасць і ў Кітаі, і ў ЗША. ***«Людзям, якія перахварэлі, трэба ганарыцца, што яны вытрымалі, а не баяцца, што пра іх нешта скажуць»***, — дае параду Аляксандр Лукашэнка.

У кругласутачным рэжыме працуе сёння 25 лабараторый па выяўленні інфекцый. Прэзідэнт зноў выказаў сваю незадаволенасць якасцю і айчынных, і імпартных тэстаў. У залежнасці ад рэгіёна забяспечанасць імі складае ад 25 дзён да месяца, кожны дзень папаўняючыся распрацоўкамі.

Ёсць ва ўлады і план дзеянняў пры негатыўным сцэнарыі развіцця падзей. «Калі становішча будзе мяняцца ў горшы бок (я нічога не выключаю, я ўжо перажываю за любы шорах), то мы падключым рэзервы. У нас іх дастаткова, але зараз іх выкарыстоўваць нельга», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Барацьбу з каранавірусам краіна пачынала толькі сіламі сістэмы аховы здароўя, цяпер задзейнічана ў гэтым уся вертыкаль улады. Сістэма наладжана так: урачы — лечаць, улады — забяспечваюць усім неабходным. То-бок кожны займаецца сваёй справай. Таму разам з членамі ўрада, старшынямі аблвыканкамаў на нараду запрасілі ўпаўнаважаных па рэгіёнах і памочнікаў Прэзідэнта.

Трайны ўдар па эканоміцы

«Нельга ўпадаць у крайнасці, нельга спыніць працу ключавых галін эканомікі. Жыццё паказала літаральна праз месяц-паўтара, што зрабілі правільна. Зараз усе ўжо больш кажуць пра эканоміку, пра тое, як будзем жыць далей, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Пандэмія пройдзе, а есці што будзем? Вы памятаеце мой гэты выраз. Сёння ўжо ніхто не крытыкуе за гэта». І больш за тое, усе схапіліся за эканоміку, якую трэба падымаць. «У нас няма іншых крыніц для жыцця, акрамя працы нашых людзей», — заўважыў Прэзідэнт.

Ён заклікаў усіх, хто застаўся без працы, не чужацца існуючых на рынку вакансій і гэтым складаным часам папрацаваць нават на нелюбімым месцы. «Не трэба «на злобу дня» абяцаць, што мы ўсім дапаможам. ***Дапаможам толькі тым, хто гэтага заслугоўвае, хто сёння стараецца працаваць»***, — вось практыка, якую прапануе кіраўнік краіны.

«Калі праўду казаць, то наша невялікая эканоміка, у якой няма сыравіннай падушкі бяспекі, была вымушана парыраваць адначасова некалькім ударам», — заўважыў Прэзідэнт, назваўшы як прыклад нафта-газавыя непаразуменні з Расіяй, разрыў існуючых эканамічных сувязяў і закрыццё межаў і, канешне, саму пандэмію.

І задача — у першую чаргу для ўрада — утрымацца і не звaліцца па асноўных паказчыках эканамічнага развіцця. ***«Усімі сіламі трэба захаваць давер людзей да эканамічнай палітыкі, якую праводзім, цэнавую ўстойлівасць па меншай меры на самыя важныя для людзей тавары і паслугі.*** І ўраду нельга ўмешвацца ў дзейнасць Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Няхай міністр са сваімі падначаленымі прымае рашэнне. Ён адкажа перадусім за цэнаўтварэнне ў краіне», — даручыў Аляксандр Лукашэнка.

Павінны ўлады забяспечыць занятасць і захаваць прыбыткі грамадзян, пры гэтым стымулюючы бізнес. Асаблівае патрабаванне — да сферы грамадскага харчавання: не завышаць цэны і прапаноўваць дастаўку. «Многія рэстараны, пункты грамадскага харчавання пайшлі па гэтым шляху. А некаторыя сядзяць склаўшы рукі і чакаюць, што ім хтосьці нешта дасць. Ніхто нікому нічога не дасць. А калі хтосьці хоча, каб яму далі, хай скажа, дзе гэта ўзяць. Мы, што, сёння будзем забіраць у людзей, якія напружваюцца, і аддаваць тым, хто сёння гультайнічае? Гэтага не будзе, як бы непапулярна гэта ні гучала напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

Прэм'ер-міністр Сяргей Румас, які першым пачаў даклад, расказаў, што знешняе гандлёвае сальда краіны склала 425 мільёнаў долараў. Тэмп росту ВУП па першым квартале — 99,7 %, гэта ніжэй на адзін працэнтны пункт квартальнага прагнозу, але вышэй за ўсе адзнакі — і знешнія, і ўнутраныя. Ва ўмовах пандэміі ўрад зрабіў акцэнт на развіццё ўнутраных галін. Дадало будаўніцтва, сельская гаспадарка, інфармацыйныя тэхналогіі, дрэваапрацоўка, фармацэўтыка, металургія. «Па ўсіх іншых сектарах таксама ёсць станоўчая дынаміка. На працягу лютага-сакавіка прыбаўлялі ўсе, акрамя аб'ектыўна нафты, якая пачала прырастаць з красавіка», — пералічыў падрабязнасці Сяргей Румас.

Бяспека: ядзерная і энергетычная

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з літоўскім калегам Гітанасам Наўседам развіццё эканамічных адносін.

Тэлефонная размова адбылася ўчора перад вялікай нарадай у Палацы Незалежнасці. Літоўскі бок закрануў пытанні павелічэння паставак тавараў з выкарыстаннем Клайпедскага порту. На парадку размовы былі і планы па дыверсіфікацыі паставак энергарэсурсаў. Пытанні энергетычнай бяспекі падрабязней разгледзяць па даручэнні лідараў адпаведныя міністэрствы. Акрамя таго, прэзідэнты абмеркавалі супрацоўніцтва ў сферы ядзернай бяспекі. Не абмінулі і надзённае — процідзеянне каранавіруснай інфекцыі.

Паводле БелТА.

Блізкая ўлада

Вашых званкоў чакаюць

Традыцыйна, па суботах, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 25 красавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валерый Васілевіч РАБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;
- кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;
- кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Інтэграцыя

НА ПАДМУРКУ СУМЛЕННАСЦІ

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС спадзяецца на зацвярджэнне Стратэгічных кірункаў развіцця ЕАЭС сёлета ў маі

«Члены Савета ЕЭК, Калегіі добра папрацавалі, пакінулі для нас усяго адно, але вельмі адчувальнае пытанне. Нагадаю, кіраўнікі дзяржаў шостага снежня 2018 года даручалі нам прадставіць гэты дакумент ім для зацвярджэння да канца 2019 года. На жаль, мы гэты тэрмін парушылі. Тым не менш спадзяюся, што на чарговым пасяджэнні 19 мая 2020 года Вышэйшы Еўразійскі эканамічны савет Стратэгічныя кірункі зацвердзіць», — пачаў пазачарговае (у фармаце відэа) пасяджэнне Еўразійскага міжурадавага савета кіраўнік беларускага ўрада.

Сяргей Румас згадаў, што ў Дэкларацыі аб далейшым развіцці інтэграцыйных працэсаў у рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, у мэтах рэалізацыі якой і распрацаваны дакумент, адзначана: поўнае выкананне дамоўленасцяў ва ўсталяваных Дагаворам аб ЕАЭС сферах, далейшае ўдасканаленне функцыянавання і раскрыццё інтэграцыйнага патэнцыялу ЕАЭС патрабуюць прыняцця амбіцыёзных рашэнняў па развіцці інтэграцыі, пашырэнні абласцей эканамічнага супрацоўніцтва і ўдасканаленні інстытутаў ЕАЭС.

«Не бяруся судзіць, наколькі падрыхтаваны праект Стратэгічных кірункаў гэтаму пасылу адпавядае, многія сапраўды амбіцыёзныя прапановы Камісіі і бакоў былі намаганнямі асобных экспертаў выключаныя, нават не дайшоўшы да разгляду на высокім узроўні. Па цэлым шэрагу мер прыняты максімальна мяккія фармуліроўкі, і толькі практыка рэалізацыі Стратэгічных кірункаў пакажа, як далёка мы зможам прасунуцца ў тых ці іншых інтэграцыйных сферах», — прадказаў прэм'ер-міністр.

Пры гэтым ён аддаў належнае, што праект дакумента стаў вынікам дастаткова складанага кампрамісу бакоў. Аднак, упэўнены Сяргей Румас, у краевугольных для стварэння і функцыянавання сапраўднага эканамічнага саюза сферах бакі мусяць сумленна і адкрыта дамаўляцца, каб не паўтарыць лёс цэлага шэрагу прататыпаў эканамічнага саюза.

Аб правядзенні пазачарговага пасяджэння Еўразійскага міжурадавага савета для разгляду няўзгодненых пытанняў па праекце Стратэгічных кірункаў развіцця Еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года бакі дамовіліся на папярэдняй сустрэчы 10 красавіка, якое таксама адбылося ў рэжыме відэаканферэнцыі.

Варвара МАРОЗАВА.

На слыху

РАССЛАБЛЯЦЦА РАНА

У Беларусі з пачатку ўспышкі зарэгістравана 8022 выпадкі COVID-19. Прырост за апошнія суткі склаў 741 выпадак. Папраўліся 938 чалавек, у якіх раней была лабараторна пацвержана каранавірусная інфекцыя. Усяго ў краіне праведзена 122 543 тэсты. За ўвесь перыяд распаўсюджання інфекцыі памерла 60 пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй і хранічнымі хваробамі.

Міністэрства аховы здароўя і кіраўніцтва праваслаўнай царквы заклікаюць на вялікія выхадныя, у тым ліку на Радаўніцу, не выязджаць за межы вашых населеных пунктаў, не наведваць могілкі і не сустракацца з роднымі і блізкімі, у прыватнасці з людзьмі сталага веку.

У Беларусі ў гэты час праходзіць рэспубліканскі маніторынг установаў аховы здароўя па гатоўнасці работы ў перыяд эпідэмічнага пад'ёму COVID-19. На мінулым тыдні рэспубліканская рабочая група ў складзе галоўнага пазаштатнага інфекцыяніста Міністэрства аховы здароўя Ігара Карпава, галоўнага пазаштатнага анестэзіёлага-рэаніматолага Міністэрства аховы здароўя Аляксандра Дзядзько, загадчыка кафедры інфекцыйных хвароб БелМАПА Юрыя Горбіча і іншых вядучых спецыялістаў правялі маніторынг установ аховы здароўя Мінска, Віцебскай, Мінскай і Брэсцкай абласцей. Праблемныя пытанні яны абмеркавалі ў рэжыме відэаканферэнцый з галоўнымі ўрачамі бальніц раёнаў. Прыняты неабходныя кіраўніцкія рашэнні з прадстаўнікамі выканкамаў.

На гэтым тыдні рэспубліканская група наведала ўстановы аховы здароўя Буда-Кашалёва і Гомеля. Спецыялісты правялі кансіліумы для складаных пацыентаў. Асаблівую ўвагу ўдзялілі абароненасці медработнікаў. У найбліжэйшы час маніторынг працягнецца — спецыялісты наведаюць і іншыя бальніцы, правядуць нарады з удзелам кіраўніцтва рэгіёнаў.

Алена КРАВЕЦ.

На кантролі

Выяўляюць парушэнні з боку кіроўцаў-транзітнікаў

За невыкананне кіроўцамі патрабаванняў па пастанове № 171 Транспартная інспекцыя выявіла 192 факты парушэння кіроўцамі, якія праязджаюць транзітам па тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, па 107 фактах распачаты адміністрацыйны працэс (арт. 23.4 КаАП РБ), 16 кіроўцаў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, па 85 фактах былі выкліканы супрацоўнікі мытных органаў і ДАІ.

Паводле інфармацыі ДАІ, выяўлена 692 парушэнні, па звестках Дзяржаўнага мытнага камітэта — 576.

На сёння кіроўцам, якія ажыццяўляюць транзітныя аўтамабільныя перавозкі грузаў, Транспартнай інспекцыяй выдадзена 15 599 патрабаванняў.

У мэтах аператыўнага рэагавання і павышэння эфектыўнасці мер па прадухіленні распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі на тэрыторыі краіны Мінтранс сумесна з МУС прапаноўвае грамадзянам у выпадку выяўлення фактаў парушэння пастановы Саўміна № 171 кіроўцамі міжнароднікаў інфармаваць аб дадзеных фактах супрацоўнікаў органаў ДАІ па тэл. 102 і Транспартнай інспекцыі па тэл. (017) 286 76 96.

У дачыненні да правапарушальнікаў выкарыстоўваецца адміністрацыйнае спагнанне. Санкцыя ў адпаведнасці з арт. 23.4 КаАП Рэспублікі Беларусь прадугледжвае накладанне штрафу да 50 базавых велічынь або адміністрацыйны арышт.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЕЛАРУСКІЯ АРТЫСТЫ ЗНОЎ СПЯЮЦЬ У ПАДТРЫМКУ МЕДЫКАЎ

Другі па ліку музычны анлайн-марафон у падтрымку медыцынскіх работнікаў #БеларусьБезCovid правядзе 24 красавіка прадзюсарскі цэнтр «Спамаш». На працягу 10 гадзін у сталічнай студыі гуказапісу будзе гучаць жывая музыка, а слухачам і гледачам канцэрта прапануюць паўдзельнічаць у збору сродкаў на дабрачынны рахунак Віцебскай абласной клінічнай бальніцы.

Музычны марафон ужо згадзіліся падтрымаць папулярныя беларускія артысты і калектывы: заслужаныя артысты Беларусі Аляксандр Саладуха, Іскуі Абалян, Алена Ланская, беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», гурты «Дзядзька Ваня», «Тяни-Толкай», Las Vegas, саліст Вялікага тэатра Беларусі Ілья Сільчукоў, артысты прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» Іван Зданюк і Ксенія Галецкая, Саша Нема, Аляксей Хлястоў, Віталь Варанко, Улад Чыжыкаў і гурт «Радыёхваля», Ганна Шалюціна і Yogurt band, Саша Захарык, пераможцы беларускага нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне» дуэт VAL і многія іншыя. А віртуальна да канцэрта далучацца таксама выканаўцы з блізкага замежжа — Руслан Аляхно, які цяпер знаходзіцца ў Расіі, Яўген Літвінковіч (Украіна), Дамінік Джокер (Расія) — і пляменнік славутага італьянскага спевака Фабрыцыа Чэлентана (Італія).

Дарэчы, другі анлайн-марафон #БеларусьБезCovid падтрымае міждзяржаўная тэлерадыёкампанія «MIP», якая з 12 гадзін 24 красавіка зладзіць прамую трансляцыю шматгадзіннага канцэрта на радыё «Мір» у Беларусі», на сайце https://mir24.tv і на ўсіх сваіх афіцыйных старонках у сацсетках. Таксама трансляцыя будзе дасяжная на YouTube-канале TheSpamash https://www.youtube.com/user/TheSPAMASH і на платформе gigagig.tv.

Нагадаем, першы музычны анлайн-марафон прайшоў у студыі «Спамаш» 3 красавіка. Яго трансляцыю на розных платформах паглядзела амаль 8 тысяч інтэрнэт-карыстальнікаў, а на рахунак мінскай 3-й гарадской клінічнай бальніцы імя Я. Клумава паступіла каля 24 тысяч беларускіх рублёў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Fitch прадказала рэцэсію «беспрэцэдэнтнай глыбіні»



Агенцтва Fitch з-за каранавіруса чакае сёлета ў сусветнай эканоміцы рэцэсію «беспрэцэдэнтнай глыбіні» для пасляваеннага перыяду. Гэта гаворыцца ў красавіцкім дакладзе Global Economic Outlook (GEO). Паводле новага прагнозу аналітыкаў агенцтва, глабальны ВУП паменшыцца на 3,9 %. Эканоміка еўразоны знізіцца ў гэтым годзе на 7 %, ЗША — на 5,6 %, Вялікабрытаніі — на 6,3 %. Прагноз зніжэння сусветнага ВУП у працэнтным выражэнні эквівалентны яго падзенню на $2,8 трлн у параўнанні з узроўнем 2019 года і прадугледжвае страту $4,5 трлн у параўнанні з прагнозам Fitch для глабальнай эканомікі на бягучы год, які быў зроблены да ўзнікнення пандэміі. «Найбольш істотна прагноз пагоршаны для еўразоны, дзе ўведзеныя абмежавальныя меры аказалі сур'ёзны ціск на эканамічную актыўнасць ужо ў першым квартале», — адзначаецца ў дакладзе.

Netflix падчас каранціну павялічыў аўдыторыю на 16 мільёнаў падпісчыкаў

Стрымінгавы сэрвіс Netflix апублікаваў справаздачу з вынікамі дзейнасці ў першым квартале. 2,3 млн новых карыстальнікаў з'явілася ў Netflix у ЗША і Канадзе, 6,9 млн — у Афрыцы і на Блізкім Усходзе, 2,9 млн — у Лацінскай Амерыцы і 3,6 млн — у Азіі. Цяпер агульная колькасць падпісчыкаў сэрвісу па ўсім свеце дасягнула 183 мільёнаў чалавек. Кіраўніцтва Netflix выказала меркаванне, што ў другім квартале аўдыторыя павялічыцца на 7,5 млн чалавек, паведамляе Deadline. Нягледзячы на рызыкі сыходу аўдыторыі пасля каранціну, аналітык Bernstein Тод Юнгер лічыць, што людзі не змогуць адмовіцца ад выкарыстання стрымінгавых сэрвісаў. Сёлета акцыі Netflix выраслі амаль на трэць, у той час як іншыя сферы забаўляльнага бізнесу — ад тэматычных паркаў да спорту — церпяць каласальныя страты.

У Кітаі няма рынкаў, дзе гандлююць дзікімі жывёламі

Афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Гэн Шуан заявіў, што ў краіне няма так званых мокрых рынкаў, дзе гандлююць дзікімі жывёламі. «Замест гэтага ў Кітаі часцей за ўсё можна ўбачыць фермерскія рынкі і рынкі морапрадуктаў, дзе прадаюцца свежае мяса, рыба, гародніна, морапрадукты і іншыя сельскагаспадарчыя прадукты, а рынкаў, дзе гандлююць жывой хатняй птушкай, вельмі мала», — заявіў дыпламат. Ён падкрэсліў, што ўлады Кітая раней прынялі рашэнне аб забароне нелегальнага палявання і гандлю дзікімі жывёламі, а таксама ўвялі забарону на спажыванне ў ежу іх мяса.

Надвор'е

ЗЯМЛЯ ДАЧАКАЛАСЯ ДАЖДЖУ

А ў суботу ў асобных раёнах магчымы навальніцы

У другой палове гэтага тыдня на тэрыторыі краіны назіралася змена паветраных патокаў, пасля чаго пачало паступаць больш цёплае паветра. У канцы тыдня і наступныя працяглыя выхадныя дні надвор'е ў Беларусі зменіцца. Фон атмасфернага ціску будзе зніжацца, што прывядзе да павелічэння воблачнасці, а няўстойлівыя паветраныя масы і атмасферныя франты, якія ідуць з Балтыйскага мора, прынясуць кароткачасовыя дажджы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Калі ў пятніцу паветра ў нас прагрэецца да плюс 12—18 градусаў, а па паўднёвым захадзе краіны — да плюс 20, то на наступны дзень кароткачасовыя дажджы рознай інтэнсіўнасці чакаюцца на большай частцы тэрыторыі краіны. У дзённыя гадзіны ў суботу ў асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 2—8 градусаў, удзень — ад плюс 9 градусаў да 16 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 18 градусаў.

У нядзелю і панядзелак наша тэрыторыя будзе знаходзіцца ў вобласці паніжанага атмасфернага ціску, таму чакаецца распаўсюджванне халоднай і вільготнай паветранай масы. У асобных раёнах прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра зноў панізіцца. І ўжо ўначы будзе ад мінус 4 градусаў да плюс 3 градусаў, удзень — плюс 8—15 градусаў, толькі па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да 17 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у аўторак і сераду з Заходняй Еўропы чакаецца перамяшчэнне франтальных падзелаў. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Надвор'е будзе не зусім камфортнае, таму што прагназуецца зусім няўстойлівы тэмпературны рэжым. Беражыце сябе, будзьце здаровыя.

Сяргей КУРКАЧ.

Футбол

У «ДЫНАМА» НОВЫ ГАЛОЎНЫ

Леанід КУЧУК прыступае да работы са сталічнымі футбалістамі. Сёння першы матч пад яго кіраўніцтвам

Трэнер афіцыйна прадстаўлены ў якасці галоўнага наставніка, на гэтай пасадзе ён змяніў Сяргея Гурэнку. Нагадаем, на старце чэмпіянату краіны мінскае «Дынама» ў пяці матчах набрала 6 ачкоў, атрымаўшы дзве перамогі і тры паражэнні. Перад стартам першынства клуб «вылецеў» з розыгрышу Кубка краіны.

Леанід Кучук адзначыў, што для яго вялікі гонар узначаліць «Дынама», бо значная частка гісторыі станаўлення аднаго з флагманаў беларускага футбола прайшла на яго вачах. «Ніякіх сумневаў наконт работы ў «Дынама» ў мяне не было. Гэта клуб з вялікімі традыцыямі, якому хутка споўніцца сто гадоў. Бачыў у гульні выдатных спартсменаў, якія здабывалі славу айчыннага футбола. Шмат з кім з іх знаёмы асабіста. «Дынама» — гэта брэнд, які ведаюць і паважаюць ва ўсім футбольным свеце. Калі вы назіралі за маёй трэнерскай кар'ерай, то ведаеце: я рэдка прыходзіў у клуб, дзе быў поспех. Перада мной заўсёды ставілі пэўныя задачы, і я рабіў так, што клуб заставаўся на плаву і займаў высокія месцы. Чэмпіянат у Беларусі толькі пачаўся, так што нічога не страчана». Настаўнік дадаў, што ўзровень чэмпіянату Беларусі па футболе ў параўнанні з нядаўнім мінулым прыкметна вырас. «Мне ёсць з чым параўноўваць, бачыў гульні чэмпіянатаў 12 краін: пачынаючы ад Малдовы і заканчваючы Італіяй. Зараз за падзеямі ў чэмпіянаце Беларусі пільна сочаць ва ўсім свеце, і многія футбалісты мараць стаць яго ўдзельнікамі», — адзначыў Кучук.

Нагадаем, з'яўляючыся гульцом, Леанід Кучук, якому цяпер 60 гадоў, выступаў у «Гомсельмашы», віцебскім КІМе, «Маладзечне», мінскіх «Атацы» і «Дынама-93». Трэнерскую кар'еру пачаў у 1990 годзе. Пад яго кіраўніцтвам ціраспальскі «Шэрыф» шэсць разоў станавіўся чэмпіёнам і па тры разы выйграваў Кубак і Суперкубак Малдовы. Леанід Кучук прывёў маскоўскі «Лакаматыў» да «бронзы» чэмпіянату Расіі. У 2019 годзе ён узначальваў украінскі «Рух» з Львова.

Сёння сталічнае «Дынама» правядзе матч у гасцях у «Смалявічаў».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

МАСКА, ПАЛЬЧАТКІ І ДЫСТАНЦЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Інакш ставяцца да бяспекі сваіх наведвальнікаў іх калегі іншай сеткі рэстаранаў. Там загараджальнай стужкай зачынілі столікі так, што наведвальнікі проста вымушаны выконваць дыстанцыю не ў 1,5 метра, а ў цэлыя 2-3 метры. Наведвальнікаў з-за гэтага, здаецца, зусім няшмат. На заўважным месцы вісіць дазатар з антысептыкам. Работнікі ў масках і пальчатках. На зале стаіць чалавек, які амаль пасля кожнага, хто ўваходзіць у рэстаран, працірае дзвярныя ручкі. Пасля таго як наведвальнік сыходзіць, літаральна адразу столік апрацоўваюць. Нягледзячы на тое што я была там прыкладна ў той жа час вечара, што і ў першым кафэ, здавалася, нават паветра тут больш свежае. Але я думаю, што справа ўсё-такі ў тым, што ў гэтай сетцы рэстаранаў прынята часцей чысціць кандыцыянеры.

У правілах, рэкамендаваных уладамі, адзначаецца, што неабходна «забяспечыць выкарыстанне работнікамі аб'ектаў, якія маюць непасрэдны кантакт з наведвальнікамі, сродкаў абароны органаў дыхання (маскі), пальчатак, антысептыкаў для рук». Заходжу ў найбліжэйшы да дома папулярны гандлёвы цэнтр па прадукты і тут жа трапляю на жанчыну каля ўвахода, якая апрацоўвае ручкі кошыкаў нейкім сродкам. На заўважным месцы вісіць дазатар з антысептыкам і там жа побач на стойцы — сурвэткі. Жанчына, якая скарысталася дызсродкам, незадаволена і запэўнівае мяне, што ў ім проста вада, аргументуючы адсутнасцю паху. Рашаюся наліць на свае далоні антысептык і паднесці да носа. І сапраўды, без паху! Бяру тут жа сурвэтку і выціраю рукі. Для спакою дастаю з сумкі свой, які мае спецыфічны «водар». У хлебным аддзеле кухары ў масках і пальчатках выкладваюць упакаваную выпечку на стэлажы. Каля касы вісяць напамінкі аб захаванні дыстанцыі. Магчыма, з-за таго, што аб'ява на ўзроўні вачэй, людзі трымалі дыстанцыю ў 1,5 метра больш ахвотна, праўда, з-за гэтага чарга расцягнулася на шмат метраў. А вось у іншым гандлёвым пункце, не менш папулярным у Мінску, дыстанцыю ніхто не трымаў, хоць людзей было поўна. Здавалася, быццам увесь раён разам вырашыў наведаць краму і пры гэтым пляваў на ўсе меры засцярогі. Але ж я там не сустрэла ні аднаго работніка без маскі. Праўда, некаторыя супрацоўнікі сцягвалі маску так, каб нос быў адкрыты... З уласнага досведу ведаю, як цяжка дыхаць пад маскай некалькі гадзін запар у памяшканні. Яшчэ мяне ўразіла, што ўсе касіры крамы былі забяспечаны пластыкавымі шчыткамі, якія закрывалі твар работніка. Гэтая маска не герметычная, але цалкам абараняе супрацоўнікаў ад пырскаў пры чханні пакупніка, які не патурбаваўся прыкрыць рот. Дзяўчына, якая абслугоўвала мяне на касе, была ў пальчатках.

У крамах нехарчовых тавараў людзей было менш, але, напрыклад, у адным з буйных універмагаў Мінска я ўбачыла толькі адну жанчыну-касіра ў пальчатках і з маскай на твары. Астатнія як быццам бы згаварыліся пры мне сцягнуць маскі на падбародак, а ў некаторых аддзелах супрацоўнікі універмага наогул былі без іх. Пальчатак на прадаўцах я таксама не ўбачыла. Але крама адкрываецца не ў дзевяць раніцы, як раней, а ў дзесяць. Відаць, гэтую гадзіну там выкарыстоўваюць на апрацоўку не толькі самога памяшкання, але і магазіна звонку. Да такой высновы я прыйшла, калі ўбачыла, што асфальт каля вонкавых вітрын і лесвіцы па раніцах пакрыты белым налётам. А вось у адным з сэканд-хэндаў мяне чакаў прыемны сюрпрыз. Пакупнікі выконвалі дыстанцыю, а касір была ў масцы і пальчатках, да таго ж перыядычна апрацоўвала чымсьці паверхню стала з касай, за якім стаяла.

У правілах, рэкамендаваных Мінгарвыканкамам, ёсць пункт, які прадугледжвае вытворчы кантроль за санітарным утрыманнем грамадскага транспарту. Праўда, гэтая мера часам палохае пасажыраў, якія любяць паспаць у транспарце. Аляксандр, кіроўца аўтобуса аўтапарка № 6, расказаў, як смяяўся, калі зайшоў на дыспетчарскай станцыі ў салон з работнікамі парка, якія апрацоўваюць аўтобусы дэзсродкамі кожныя 3-4 гадзіны.

«Яны ж у ахоўных касцюмах і з распыляльным апаратам, — расказвае кіроўца. — Я буджу «соню», а ён, расплюшчыўшы вочы, як падскочыць! Небарака амаль бег ад аўтобуса!»

Сам кіроўца прызнаўся, што ў парку амаль усе яго калегі старанна выконваюць правілы асабістай гігіены. Нягледзячы на тое што ў кіроўцаў асобная кабіна, многія носяць маскі і выкарыстоўваюць пальчаткі. Гэта звязана з тым, што ім даводзіцца прадаваць талончыкі пасажырам. У маршрутках кіроўцы таксама выкарыстоўваюць антысептыкі для рук, і многія вядуць аўтамабіль у масцы, але пальчаткі носяць не ўсе.

— На самай справе вельмі важна выконваць гэтыя рэкамендацыі, — гаворыць **начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Ніна ЕМЯЛЬЯНАВА.** — Мы прапанавалі адмяніць у Мінску правядзенне кірмашоў, прэзентацый і выстаў. Раім прыбіраць жылыя шматкватэрныя дамы з выкарыстаннем дэзынфіцыруючых сродкаў і натуральна. Работнікам сферы абслугоўвання трэба не толькі быць забяспечанымі маскамі, але і ўмець іх правільна насіць. Недапушчальна прадаўцу апускаць маску на падбародак або не закрываць нос. Гэта проста ілюзія стрымлівання распаўсюджвання інфекцыі, і плёну не дае. Важна сур'ёзна ставіцца да рэкамендаваных правілаў. Але нашы пакупнікі часам да сваёй бяспекі ставяцца безадказна. Нават калі крама будзе рабіць кожныя пяць хвілін аб'явы пра тое, што трэба захоўваць дыстанцыю, на кожнай касе вывесяць аб'явы і нанясуць на падлогу разметку «Трымай дыстанцыю», людзі ўсё роўна «не чуюць» і «не бачаць». Сёння ў кожнага беларуса ёсць магчымасць стаць крыху лепшым! Для гэтага трэба проста выконваць правілы, якія дапамогуць нам папярэдзіць распаўсюджванне інфекцыі і тым самым зберагчы людзей, якія знаходзяцца ў зоне рызыкі.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Фінансы

МІКРАКРЭДЫТЫ ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

У нашай краіне 27 красавіка ўступае ў сілу Указ Прэзідэнта № 394 «Аб прадастаўленні і прыцягненні пазык», прыняты для ўпарадкавання дзейнасці па рэгулярным прадастаўленні і прыцягненні пазык і ўзмацнення абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг. Пракаментаваў нормы гэтага дакумента падчас анлайн-брыфінгу начальнік Галоўнага ўпраўлення рэгулявання некрэдытных фінансавых арганізацый Нацыянальнага банка краіны Дзмітрый НАБЗДОРАЎ.

Да гэтай просьбы лепш прыслухацца

Дзмітрый Набздораў папрасіў ад імя Нацыянальнага банка кіраўніцтва мікрафінансавых арганізацый па магчымасці знізіць стаўкі і даць адтэрміноўкі плацяжоў тым кліентам, якія цяпер аказаліся ў складаных фінансавых умовах. Дадзеныя рэкамендацыі накіраваны і ў Асацыяцыю мікрафінансавых арганізацый, і ў Асацыяцыю лізінгадаўцаў, каб фінансавыя інстытуты ўважліва ставіліся да ўзніклай сітуацыі і пры наяўнасці дакументальна пацверджанага ад спажыўца фінансавай паслугі факту зніжэння альбо страты даходу ішлі насустрач у плане зніжэння працэнтных ставак, адтэрміновак, непрымянення пені, штрафу і няўстойкі.

Нацбанк абяцае маніторыць сітуацыю разам з Асацыяцыяй мікрафінансавых арганізацый. «Мы вельмі ўважліва будзем адсочваць, як на кожны зварот грамадзяніна зрэагавала тая ці іншая юрыдычная асоба. Гэтая інфармацыя будзе ўлічвацца пры планаванні праверак на наступнае паўгоддзе», — адзначыў прадстаўнік Нацбанка.

Больш не загоняць у непад'ёмныя даўгі

Цяпер сума працэнтаў за ўвесь тэрмін карыстання мікрапазыкай не можа перавышаць двухразовай сумы пазыкі, а сума няўстойкі (штрафу, пеняў) не можа быць вышэйшай за палову сумы доўгу. Гэта значыць, калі вы ўзялі ў такой арганізацыі 200 рублёў, то сума працэнтаў не можа перавышаць 400 рублёў, штрафу за пратэрміноўку — 100 рублёў.

Не дапускаецца ўключэнне ў дагавор умоў аб спагнанні з пазычальніка павышаных працэнтаў за карыстанне мікрапазык у выпадку невыканання або неналежнага выканання абавязацельстваў па дамове. Як растлумачыў Дзмітрый Набздораў, захаваецца магчымасць датэрмінова пагасіць пазыку, а таксама ўстаноўка верхняга падзелу ставак па іх.

Прадстаўнік Нацбанка падкрэсліў, што дзеянне дакумента распаўсюджваецца і на новыя, і на раней заключаныя дагаворы. Арганізацыям даецца два месяцы на прывядзенне старых дагавораў у адпаведнасць з прынятымі дакументамі.

Паводле звестак Нацбанка, летась аб'ём выдадзеных мікрапазык вырас на 20 % да 2018 года — да 131 млн рублёў. Колькасць пазычальнікаў павялічылася на 8 %. Сярэдняя сума пазык складала 115 рублёў.

Ламбарды па новых правілах

Таксама гэтым дакументам зменены падыходы да фарміравання статутнага фонду ламбарда. Цяпер ён павінен быць сфарміраваны шляхам унясення грашовых сродкаў у памеры не менш чым мінімальны памер статутнага фонду, устаноўленага Нацбанкам. Чакаецца, што гэта дазволіць палепшыць фінансавае становішча ламбардаў і павысіць узровень адказнасці іх заснавальнікаў.

Пры гэтым пашыраны пералік відаў дзейнасці, дазволеных ламбардам. Яны могуць прадастаўляць мікрапазыкі грамадзянам пад заклад транспартных сродкаў без абавязку перадачы прадмета закладу ў ламбард, ажыццяўляць камісійны гандаль, захоўванне рэчаў і іх набыццё для рэалізацыі.

Пры ўзнікненні канфліктнай сітуацыі паміж пазычальнікам і пазыкадаўцам да звароту ў суд або Нацбанк абавязковым будзе прад'яўленне бакамі спрэчкі прэтэнзіі — пісьмовай прапановы аб добраахвотным рэгуляванні ўзніклай спрэчкі.

Рэклама і золата

Таксама ўказам устаноўлены патрабаванні да рэкламы як да дзейнасці па прыцягненні пазык. Яна павінна будзе змяшчаць поўную і дакладную інфармацыю аб рэкламадаўцах і рэкламаванай імі дзейнасці. Гэта патрабаванне распаўсюджваецца як на арганізацыі, уключаныя ў рэестр мікрафінансавых арганізацый, так і на любыя суб'екты, якія прадастаўляюць грашовыя сродкі ў пазыку.

У адпаведнасці з новаўвядзеннямі, членамі спажыўных кааператываў фінансавай узаемадапамогі (для атрымання фінансавання сваёй дзейнасці) змогуць стаць фізічныя асобы, якія вырабляюць сельгаспрадукцыю, ажыццяўляюць віды дзейнасці, калі выплачваецца адзіны падатак, а таксама суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

Пасля ўступлення ў сілу змяненняў прадастаўляць пазыкі пад заклад рухомай маёмасці змогуць таксама дзяржаўныя юрыдычныя асобы, якія аказваюць бытавыя паслугі і зарэгістраваныя ў сельскай мясцовасці, а таксама тыя асобы, якія ажыццяўляюць скупку каштоўных металаў і камянёў для папаўнення Дзяржфонду каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

Акрамя таго, для выключэння асобных нядобрасумленных практык прадастаўлення грашовых сродкаў абмяжоўваецца спектр рэчаў, якія могуць быць прадметам лізінгу па дагаворах зваротнага лізінгу, якія заключаюцца з фізічнымі асобамі. Цяпер, пачынаючы з 27 красавіка, імі могуць выступаць толькі транспартныя сродкі і жылыя памяшканні. Раней нараканні выклікалі здзелкі па прадастаўленні грамадзянам грашовых сродкаў пад высокія працэнты, якія афармляюцца ў выглядзе зваротнага лізінгу мабільных тэлефонаў і камп'ютарнай тэхнікі.

Сяргей КУРКАЧ.

Навука

ДАСЬЕ НА БАЛОТА

Вучоныя Беларусі сабралі багаты матэрыял пра адзін з унікальных аб'ектаў запаведнага фонда краіны — балота Дзікае, якое знаходзіцца на тэрыторыі Нацыянальнага парка «Белавежская пушча». Гэта трэцяе па памерах балота ў Беларусі і адзін з найважнейшых прыродных аб'ектаў у свеце. Тут гняздуецца 140 відаў птушак, 39 працэнтаў з якіх маюць міжнародны ці нацыянальны стасус аховы.

На працягу шматгадовых палявых даследаванняў балотнага масіва і прылягаючых тэрыторый вучоныя збіралі звесткі пра клімат, рэльеф, гідралогію і гідраграфію, стратыграфію тарфяных залежаў, ландшафты асабліва ахоўнай тэрыторыі. Апісаны флора і фаўна, складзены спісы рэдкіх і ахоўных раслін і жывёл. Да таго ж прааналізаваны рэкрэацыйны і сацыяльна-эканамічны патэнцыял раёна, звесткі пра гісторыка-культурную спадчыну.

Усю гэту інфармацыю можна знайсці ў выданні «Балота Дзікае», падрыхтаваным калектывам аўтараў пад агульнай рэдакцыяй намесніка дырэктара Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі Дзмітрыя Грумо. Гэтае выданне распачынае серыю пра водна-балотныя ўгоддзі міжнароднага значэння на тэрыторыі Беларусі, якія ахоўваюцца ў адпаведнасці з Рамсарскай канвенцыяй.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

НЕ СУДЗІ... І НЕ СУДЗІМЫ БУДЗЕШ

Да сваіх пяцідзесяці з добрым хвастом Іван Фаміч жыў досыць удала. Пасля арміі ўладкаваўся на завод, ажаніўся з малодшай сястрой свайго былога аднакласніка. І сталі яны жыць-пажываць ды дабра нажываць: спярша — траіх дзяцей, потым прасторную кватэру ў заводскім доме, усю патрэбную мэблю...

І дачу яго жонка вельмі ж хацела, каб не карміць дзяцей магазіннай хіміяй, каб хоць на выхадныя з імі за горад уцякаць, каб свой кветнік, садок...

Воўк, як вядома, сабакі не баіцца, але звягі не любіць: давялося Фамічу запрэгчыся ў будоўлю, сваімі рукамі злажыць досыць прыгожы цагляны дамок, паставіць цяпліцы, пасадзіць з дзясятак пладовых дрэў.

Факт, што з часам на цвіценне кветак ды збор ураджаю да іх суседзі сталі прыходзіць, каб палюбавацца на тое, што вырасла, ды павохкаць ад зайздрасці.

...Гэта да таго, што і Фаміча, і жонку яго, і нават дзяцей і ў доме, і на лецішчы ведалі як людзей працавітых, старанных, гатовых прыйсці на дапамогу — прычым любому.

А зрэшты — не: аднаго чалавека Фаміч цярпець не мог. Гэта быў Ігарок, таленавіты слесар, які мог любую дэталь зрабіць (да матацыкла, да машыны), а ўжо нажы ў яго былі такія прыгожыя, што асобныя гаспадыні шкадавалі карыстацца, адна адной паказвалі, расказвалі, што грошай за сваю работу Ігарок не бярэ, а вось ад гарэлкі ніколі не адмаўляецца.

І таму Фаміча, які жыў за тонкай панэльнай сценкай, даўно ўжо «дасталі» і п'янкі-гулянкі, і амаль пастаянныя «заплывы ў шырыню». «Паглядзі на сябе, — казаў ён часам Ігарку. — Ты ж не чалавек амаль! Гэта ж трэба так апусціцца, прапіць і жонку, і здароўе...» — «Майстэрства засталося», — з форсам перапыняў яго сусед. — «А толку?... Кватэра пустая, халадзільнік пусты, ні людскай адзежы ў цябе, ні абутку. Бамжы выглядаюць лепей...»

Пра гэта Фаміч нагадваў Ігарку разоў колькі на месяц. Ён ніколі не думаў, што вось гэта можа выглядаць... ён сам.

У той дзень (сям'я на дачы была) да Фаміча завітаў даўнейшы армейскі сябар з пляшкай дарагога каньяку (гаспадар сваю таксама дастаў)... Гадоў з дзесяць мужчыны не сустракаліся, не сядзелі за сталом — мелі што ўспомніць, чым падзяліцца, што абмеркаваць.

І не сказаць, каб позна сядзелі ці п'яныя былі. Фаміч — на сваіх дваіх, пры яснай памяці — праводзіў сябра на таксі, прыйшоў дамоў, лёг, але да раніцы недаспаў — душыла страшэнная смага. Паспрабаваў прагнаць яе вадой — марна: шурпаты язык абдзіраў у роце сухія шчокі.

Расолу ў хаце не было, гараж далёка, чаю зусім не хацелася. І тады ён успомніў, што яшчэ «ўчора», у маладосці, яму здаралася выбіваць клін клінам...

Карацей, бліжэй да васьмі з чырвоным і апухлым пасля ўчарашняга тварам, у старым трыко і хатніх тапках на босую нагу ён пашыбаваў у найбліжэйшую краму.

Самы першы купіў гарэлкі, праз пяць хвілін вярнуўся да сваіх дзвярэй — з пляшкай, але... без ключоў.

Запасныя былі ў жонкі (гэта значыць, на дачы) і тут, у горадзе, у замужняй дачкі. Ёй як быццам можна было б пазваніць — яна прывезла б...

Аднак мабільны таксама застаўся ў кватэры. Ды і на нейчыя вочы ў гэткім стане Фамічу трапляць не хацелася...

Пасля горкага роздуму пазваніў у кватэру суседа. Ігарок сустрэў яго з насцярогай, але, убачыўшы пляшку, адразу падабрэў: яны дружна ўзялі па першай, пасля чаго Фаміч ужо смела расказаў пра сваю непрыемнасць.

Сусед з ходу ўсё зразумеў: выцягнуў з шафы пакунак з процьмай нейкіх жалезак, потым хвілін з дзесяць «паваражыў» каля замкнутых дзвярэй...

Па другой яны пілі ўжо на кухні ў Фаміча, і гаспадар — шчаслівы — нават прабачэння ў Ігара прасіў за тое, што некалі бэсціў.

Бо яно ж сусед ёсць сусед. І ён — нават такі, як Ігар, — бывае болей патрэбны, чым далейшы родзіч.

Л. Хмыль,

г. Бабруйск.

НЕ «АДЗЕЖА» ЗДОБІЦЬ ЧАЛАВЕКА, АЛЕ...

Мода — не вам казаць — бывае не толькі на вопратку, абутак, мэблю, смартфоны, але і на... імёны. Расказвалі, адна маладзіца з дачушкай на дзіцячую пляцоўку выйшла, з іншымі матулямі разгаварылася — даведалася, што ў пясочніцы гуляюць маленькія Ізабела, Віялета, Афрадыта і Аэліта. Ёй за сваю Марусю аж няёмка стала...

Гэта — пра імёны для дзяўчынак. З хлопчыкамі, вядома ж, не прасцей. Не ведаю, якія звесткі могуць даць аддзелы загсаў, але мне здаецца, што ў апошні час ну вельмі папулярныя сталі імёны Радзівон, Яраслаў, Багдан.

З гэтай нагоды адна гісторыя.

...За час працы ў школе мне даводзілася сутыкацца з самымі рознымі імёнамі вучняў, з рознымі прозвішчамі. Некаторыя былі прыгожыя, мілагучныя, некаторыя, можа, і не вельмі. Але ж недарэмна кажуць, што не «адзежа» здобіць чалавека, а чалавек адзежу.

Дык вось. У пачатку таго навучальнага года мне зноў дастаўся пяты клас (з адзінаццатым у маі развіталіся)... Адказны момант — знаёмства з вучнямі: ад таго, якім яно будзе, у многім залежаць далейшыя адносіны...

Ведаю: дзеці не вельмі любяць, калі іх называюць па прозвішчах — лепш па імёнах, але ж запомніць усе і адразу досыць складана.

Папярэдне праглядаю спіс і вачам не веру: у маім класе з 22 вучняў... палова Уладзіславаў, чатыры Кацярыны, тры Данілы і тры Дар'і. Значыць, з запамінаннем імён ніякіх праблем?

І на прозвішчы тады звярнула ўвагу: Рыбак, Мянтус, Галавач...

Аднак гэта — палова гісторыі. Як заўсёды, дайшла чарга да дзённікаў. На дошцы пішу расклад урокаў і факультатыўных заняткаў, імёны-прозвішчы настаўнікаў: матэматыка — Бурак, англійская мова — Капуста, беларуская мова і літаратура — Салата...

Карацей — з вучняў у нас атрымаўся вадаём з рыбкамі, а з настаўнікаў цэлы агарод!

Цяжка было не рассмяяцца.

А бацькам, выбіраючы імёны для сваіх нашчадкаў, не грэх бы і задумвацца, ці трэба гнацца за модай.

І. Салата,

г. Гродна.

ПІЦЬ МОЖНА ЎСІМ... АЛЕ, ВЯДОМА Ж, НЕ ЎСЁ

...Ёсць меркаванне, што плёткі плесці ды языкамі малоць любяць жанчыны. Мужчынам, маўляў, гэта не ўласціва.

1970 год — Кітай запусціў свой першы штучны спадарожнік Зямлі «Дунфан Хун-1». У 1992 годзе краіна пачала рэалізацыю праектаў пілатуемых касмічных палётаў. 15 кастрычніка 2003 года кітайскі касманаўт Ян Лівэй здзейсніў першы пілатуемы палёт у космас на караблі «Шэньчжоў-5».

Так гаварыў...

СТАНІСЛАЎ ЕЖЫ ЛЕЦ:

«Тоўсценькія жывуць менш, затое ядуць больш».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.48	20.29	14.41
Віцебск —	5.34	20.22	14.48
Магілёў —	5.38	20.19	14.41
Гомель —	5.39	20.11	14.32
Гродна —	6.03	20.43	14.40
Брэст —	6.08	20.39	14.31

Месяц

Маладзік 23 красавіка. Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Анціпа, Івана, Прохара, Пятра, Рыгора, Якава.*
К. *Валерыі, Аляксандра, Аляксея, Рыгора.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Мама, я дужы, я спраўлюся!

— Сынок, будзь разумны, нават не бярыся...

— Колькі будзе два на два?
— Восем.
— Колькі?
— Шэсць.
— Падумайце.
— Чатыры.
— Чаму ж вы адразу не сказалі?
— Мама вучыла заўсёды гаварыць больш, каб было куды саступаць!

— Скажыце, гэта вы ўчора выцягнулі з палонкі майго Абрамчыка?

— Так.

— І магу я спытацца, дзе тады яго шапачка?

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1291.
Нумар падпісаны ў 19.30 23 красавіка 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

24 красавіка 2020 г. № 16 (552)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ



КРОКІ ДА РАДЫЕБЯСПЕКІ

Якія меры дазваляюць бяспечна жыць і гаспадарыць на постчарнобыльскіх тэрыторыях?

У выніку аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі доўгажывучымі радыенуклідамі было забруджана 23 % ад усёй тэрыторыі Беларусі. Што сёння адбываецца з гэтымі землямі?

Сітуацыя існуючага апрамянення

У першы перыяд пасля катастрофы на ЧАЭС частка беларускіх зямель была выведзена з гаспадарчага абароту з прычыны высокай шчыльнасці забруджання глеб радыенуклідамі і высокай рызыкі вытворчасці «брудных» сельскагаспадарчай прадукцыі, сыравіны і кармоў. Агульная плошча такіх зямель склала каля 265 тысяч гектараў.

Сёння ж, больш чым праз 30 гадоў пасля аварыі, радыяцыйнае становішча на забруджаных тэрыторыях спецыялісты ацэньваюць як стабільнае, кантралюючае і прадказальнае.

— Ідзе манатоннае зніжэнне доз апрамянення за кошт натуральных фізічных працэсаў (радыяцыйны распад радыенуклідаў, гарызантальная і вертыкальная міграцыя, працэсы выветрывання і паветранага пераносу) і дзейнасці чалавека, — тлумачыць **начальнік службы радыяцыйнага маніторынгу Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыяцыйнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Міхаіл КАВАЛЕНКА.** — Таму радыяцыйнае становішча, што склалася на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, па сучаснай класіфікацыі адносіцца да сітуацыі існуючага апрамянення.

стар. 4

УЛАСНЫ БОЛЬ І ТРАГЕДЫЯ КРАІНЫ

Чарнобыльскія землі — крыніца для радыяцыйнай навукі і ўнікальнага экатурызму

Наша суразмоўца на ўласным вопыце ведае, як аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі змяніла лёсы людзей. Катастрофа напаткала яе, жыхарку Хойніцкага раёна, 14-гадовай дзяўчынай — эмацыянальныя ўспаміны пра эвакуацыю, калоны аўтобусаў з перасяленцамі, разлучаныя сем'і засталіся з ёю на ўсё жыццё. З цягам часу яна вярнулася на сваю малую радзіму, дзе ад майстра вытворчага навучання вучылішча выраслa да намесніка старшыні Хойніцкага райвыканкама. Ужо ў якасці дэпутата Палаты прадстаўнікоў, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ расказала нашаму карэспандэнту, як цяпер жывуць рэгіёны, пацярпелыя ад аварыі.

Фота house.gov.by

— Якія ўспаміны ў вас засталіся з падзей вясны 1986 года?

— Пасля аварыі, у пачатку мая, усіх дзяцей, цяжарных жанчын вывезлі з тэрыторыі раёна. Канешне, успамінаючы ўсё гэта, устрымацца ад слёз немагчыма. Стаяла вялікая колькасць аўтобусаў, куды загружалі дзяцей. Малых аддзялялі ад бацькоў, а тыя беглі за транспартам, падаючы ў дарожны пыл. У сваёй сям'і я была старэйшай, сястра меншая за мяне на пяць гадоў. Нас абедзвюх вывезлі спачатку пад Гомель, размеркавалі ў санаторыі, а потым падзялілі. Маленькіх адправілі на Міншчыну. Нас, старшакласнікаў, — у Віцебскую вобласць. Там на вакзале нас сустракала шмат людзей. І ў свой адрас мы чулі мянушкі «чарнобыльскія вожыкі» — нас сапраўды баяліся, баяліся побач хадзіць, пыталі, ці не свецімся мы ад радыяцыі, цягнулі за валасы, спрабуючы, ці сапраўдныя яны. Было ўсякае, шмат давялося перажыць. Але мы былі падлеткамі, і невялікі ўзрост дапамагаў усё гэта спакойна вытрымаць.

стар. 3

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Вынікі сесіі Савета Рэспублікі

Пра лекі, і пашпарт для рагулі. стар. 2

Жыццё побач з чарнобыльскай зонай

Там, аказваецца, усё больш будуюцца маладыя сем'і. стар. 13

Востраў Журавы. Дзе гэта?

Як сын выканаў запавет бацькі. стар. 14

Якая яна, перадавая?

Клопаты вясковых медыкаў ва ўмовах пандэміі. стар. 15

І Зарэчча стала вёскай-мемарыялам

Ідэю падказаў стары фотастэнд у «ленінскім кутку». стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Дыялог з медыкамі

Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны Прэзідэнта па Мінску Наталля КАЧАНАВА ўзяла ўдзел у традыцыйнай нарадзе са сталічнымі ўстановамі аховы здароўя. Размова, падчас якой разгледзілі сітуацыю з COVID-19, адбылася ў фармаце відэаканферэнцыі.

Як паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі, былі абмеркаваны меры эпідэміялагічнага рэагавання, пытанні забеспячэння медыкаў ахоўнымі сродкамі, паляпшэння лагістыкі лабараторнага забеспячэння, а таксама падрыхтоўка рэзерву кадраў. Аб аператыўнай сітуацыі ў сталіцы паведамілі галоўныя ўрачы цэнтральных раённых паліклінік і ўсіх стацыянараў, якія ў той ці іншай ступені маюць дачыненне да пацыентаў з каранавірусная інфекцыяй.

Асобна падкрэсліваліся своечасовасць і важнасць указа аб надбаўках медыкам, які падпісаў напярэдадні Прэзідэнт.

— Людзі працуюць самаадданa, не лічацца з асабістым часам, — сказала журналістам пасля нарады Наталля Качанава. — Нізкі ім паклон і падзяка за гэта.

Па яе словах, сітуацыя ў краіне пад кантролем. Медыкі разумеюць, што і як трэба рабіць.

Яны, адзначыла старшыня Савета Рэспублікі, настроены выратаваць кожнага чалавека. Пры выкананні ўсіх мер засцярогі мы абавязкова справімся з праблемай, якая прыйшла ў нашу краіну, выказала ўпэўненасць Наталля Качанава. І дадала, што сітуацыя ў сталіцы на асаблівым кантролі. Пры гэтым нельга зацыкліваца толькі на каранавірусе: кваліфікаваную медыцынскую дапамогу павінны атрымліваць людзі з анкалагічнымі, сардэчна-сасудзістымі і іншымі захворваннямі.

Кветкі да мемарыяла

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Каліна КАПУЦКАЯ ўзяла ўдзел у мерапрыемстве, прысвечаным Міжнароднаму дню вызвалення вязняў фашысцкіх лагераў.

Сумесна з прадстаўнікамі мясцовай улады і грамадскасці Маладзечанскага раёна Каліна Віктараўна наведала мемарыяльны комплекс «Шталаг-342». Яны ўшанавалі памяць загінулых ваеннапалонных і мірных грамадзян, усклалі кветкі да мемарыяла, на плітах якога выбіты імёны больш чым дзвюх тысяч закатаваных у лагеры вязняў. Нагадаем, шталаг — гэта лагер германскіх узброеных сіл (вермахта) для ўтрымання ваеннапалонных радавога складу.

Зямлю з вайсковага пахавання і брацкай магілы ў скверы Маладзечна ўдзельнікі мерапрыемства сабралі і змясцілі ў спецыяльную капсулу, якая 9 Мая будзе закладзена ў нішы крыпты сталічнага храма-помніка ў гонар Усіх Святых.

Атрыманы падрабязныя адказы

Сёння ў насельніцтва рэгіёнаў як ніколі шмат пытанняў да прадстаўнікоў усіх галін улады, у тым ліку і да членаў верхняй палаты парламента.

У гэтым пераканаўся член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Уладзімір Катовіч. Падчас яго прамой тэлефоннай лініі людзі пыталіся аб праблемах, якія так ці інакш датычыліся прафесійнай дзейнасці сенатара. Таксама задавалі пытанні пра эпідэміялагічную сітуацыю ў краіне, выкліканую з'яўленнем каранавіруснай інфекцыі.

На ўсе звароты, якія паступілі ў ходзе прамой тэлефоннай лініі, былі дадзены падрабязныя тлумачэнні і кансультацыі.

Антысептыкі — бальніцам

Сёння як ніколі вялікая ўвага кіраўніцтва і грамадскасці краіны прыцягнута да самаадданай, без перабольшвання, працы медыкаў, якія ў складанай абстаноўцы барацьбы з каранавіруснай інфекцыяй «трымаюць удар».

Паўсюдна, ва ўсіх рэгіёнах і ў сталіцы, пашыраецца рух дапамогі медыцынскім установам з боку дзяржаўных, прафсаюзных і грамадскіх структур і арганізацый Беларусі.

Днямі з ініцыятывы членаў Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве адбылася сумесная гуманітарная акцыя ў падтрымку медыкаў разам з Кастрычніцкай раённай арганізацыяй (г. Мінск) рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Антысептычныя сродкі былі перададзены ва ўстановы аховы здароўя сталіцы. Іх атрымалі 3-я цэнтральная раённая паліклініка і 3-я гарадская дзіцячая клінічная бальніца.

Галоўны ўрач 3-й гарадской дзіцячай клінічнай бальніцы Максім Ачарэтні выказаў праз карэспандэнта «МС» словы вялікай удзячнасці сенатарам і актывістам «Белай Русі» за падтрымку яго калектыва ў няпросты час.

Леанід ТУГАРЫН.

ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ І ЭКАНОМІКІ

Пад кіраўніцтвам Наталлі Качанавай адбылося пасяджэнне другой сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання. Разгледжана чатырнаццаць пытанняў. Зацверджаныя змены ў шэраг законаў, ратыфікаваныя асобныя міжнародныя дагаворы і пагадненні.

Фота БелТА.

Пачалася работа верхняй палаты парламента з прыняцця Заявы ў сувязі з 75-годдзем Вялікай Перамогі. Паводле слоў старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай, прыняцце Заявы яшчэ раз падкрэслівае значэнне Вялікай Перамогі для беларускага народа. Гэта напамін усім пра тое, якой цаной заваяваны мір на зямлі. Заява таксама будзе спрыяць прадухіленню спроб сказіць гістарычную праўду пра Вялікую Айчынную вайну.

Першы законапраект, змены ў які зацвердзілі сенатары, — «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб лекавых сродках». Як адзначыў міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік, карэктывы ў закон маюць мэтай удасканаліць працэс забеспячэння людзей неабходнымі лекамі. Скажам, цяпер фельчарам сельскіх ФАПаў, выязных медыцынскіх брыгад даецца права не толькі кансультаваць хворых, але і выпісваць ім рэцэпты, прадаваць лекі.

У выніку гэтых змен з'яўляецца магчымасць істотна палепшыць прафілактыку, дыягностыку і лячэнне цяжкіх захворванняў, а таксама рэдкіх хвароб. Папраўкі ў закон прадугледжваюць выкарыстанне ў асобных выпадках арыгінальных лекаў, якія знаходзяцца ў стадыі клінічных выпрабаванняў. Увогуле змены ў законе закранаюць розныя аспекты вырабу і распаўсюджвання лекавых сродкаў у краіне — напрыклад, тыя, што датычацца дзяржаўнай рэгістрацыі арыгінальных лекаў, шляхоў паляпшэння кантролю якасці іх распрацоўкі, даклінічных і клінічных даследаванняў, наступнага медыцынскага прымянення.

Устанаўліваецца парадак прамысловай вытворчасці і аптэчнага вырабу лекавых сродкаў, іх аптовай і рознічнай рэалізацыі, захоўвання, транспарціроўкі, знішчэння і г. д. Важны момант: уводзіцца адказнасць трымальніка рэгістрацыйнага пасведчання за бяспеку, эфектыўнасць і якасць прэпарату.

На думку міністра, такія змены ў законе будуць спрыяць павышэнню ўзроўню дапамогі асобным катэгорыям пацыентаў. Яны атрымаюць ранні доступ да новых метадаў лячэння з ужываннем новых, упершыню распрацаваных прэпаратаў. Такі падыход адпавядае міжнароднай медыцынскай практыцы, напрыклад, у краінах Еўрапейскага саюза і ЗША.

Трэба адзначыць карысны досвед дзейнасці Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі для паляпшэння якасці новых законаў і паправак да іх. У нашым выпадку, напрыклад, цікавым уяўляецца ход папярэдняй падрыхтоўкі да заключнага абмеркавання на сесіі змен у Закон «Аб племянной справе ў жывёлагадоўлі». Яшчэ задоўга да яго разгляду на цяперашняй сесіі Савета Рэспублікі на базе сельскагаспадарчага прадпрыемства «Саўгас «Дабраволец» Клічаўскага раёна прайшло першае ў гэтым скліканні верхняй палаты выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі. Там з удзелам навукоўцаў, прадстаўнікоў Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, ветэрынарнай службы, кіраўнікоў вядомых гаспадарак з розных рэгіёнаў краіны, спецыялістаў-практыкаў у жывёлагадоўлі, якім давядзецца потым працаваць у новых умовах, удалося грунтоўна абмеркаваць меркаваныя змяненні ў названы закон.

Тады ўзнікла гарачая дыскусія наконт неабходнасці ўкаранення ў краіне так званых племянных пашпартоў, у якіх будуць адлюстраваны асноўныя звесткі пра жывёл. І вось цяпер адной з важных змен у айчынным АПК стане пашпарт племянной жывёлагадоўлі. Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Ігар Брыло сказаў на сесіі, што адсутнасць такога пашпарта з часам пачала ставіць Беларусь у загадзя няроўныя ўмовы з іншымі краінамі пры экспарце племянной прадукцыі або матэрыялу за мяжу.

У сваю чаргу, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы падкрэсліў у ходзе абмеркавання змен у закон, што павышэнне эканамічнай эфектыўнасці жывёлагадоўлі ўяўляе не толькі вузкаведамасны інтарэс. Паспяховае развіццё гэтай галіны будзе спрыяць павышэнню экспартнага патэнцыялу ўсёй аграрнай галіны Беларусі. На думку Міхаіла Русага, генетыка — гэта найважнейшы кірунак АПК, залаты запас краіны.

Былі зацверджаны папраўкі ў шэраг іншых законаў і дагавораў. Як сказаў пасля завяршэння работы сесіі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў, большасць прынятых законапраектаў датычылася знешнеэканамічнай дзейнасці. Напрыклад, ратыфікаваны пратакол аб унясенні змяненняў у Дагавор аб ЕАЭС ад 29 мая 2014 года. У выніку павялічацца ўвазныя мытныя пошліны для Беларусі. Важнымі з'яўляюцца папраўкі ў Закон аб мерах па прадухіленні легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці і распаўсюджвання зброі масавага паражэння, у дагавор паміж Беларуссю і Малдовай аб сацыяльным забеспячэнні.

Сяргей Рачкоў так падагульніў вынікі работы другой сесіі Савета Рэспублікі: усе законапраекты ідуць ад жыцця, працуюць на эканоміку і беларускіх грамадзян.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

АНЛАЙН-СУСТРЭЧА

ПЕРАГАВОРЫ — ПА ВІДЭАСУВЯЗІ

Сустрэча з каардынатарам ААН у Беларусі

У краіне робяць усё для мінімізацыі наступстваў пандэміі каранавіруса. Пра гэта заявіла старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падчас перагавораў па відэа-канферэнц-сувязі з пастаянным каардынатарам ААН у Беларусі Іаанай КАЗАНА-ВІШНЯВЕЦКІ.

У анлайн-сустрэчы з беларускага боку таксама ўзялі ўдзел **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА і старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.**

Наталля Качанава адзначыла, што праграмы і праекты, якія рэалізуюцца па лініі ААН у Беларусі, ахопліваюць практычна ўсе сферы жыцця, у тым ліку барацьбу з распаўсюджваннем каранавіруса.

Раней паведамлялася, што ПРААН запускае новы механізм аператыўнай падтрымкі Беларусі ў барацьбе з COVID-19 і пераадоленні яго сацыяльна-эканамічных наступстваў. ПРААН аб'яднае намаганні з нацыянальнымі і мясцовымі партнёрамі, міжнароднымі арганізацыямі, агенцтвамі сістэмы ААН, бізнесам і акажа дапамогу ў памеры $250 тыс.

Спікер выказала падзяку за падтрымку і падкрэсліла, што цяпер важна падумаць аб наступствах пандэміі. «Эпідэмія, я ўпэўнена, пройдзе, мы ўсе перажывём яе. Але мы павінны бачыць наступствы для эканомікі ў нашых краінах. Зусім нядаўна Прэзідэнт разглядаў пэўныя меры па падтрымцы і эканоміке краіны, і бізнесу. Першачарговае — гэта, вядома, сістэма аховы здароўя. Але мы стараемся зрабіць усё, каб мінімізаваць страты, з якімі выйдзе наша краіна пасля гэтай сітуацыі», — заявіла старшыня Савета Рэспублікі.

Яна падкрэсліла: кіраўніцтва краіны прымае ўсе неабходныя меры для таго, каб адэкватна рэагаваць на наяўную сітуацыю. «Я рэгулярна бываю ў Міністэрстве аховы здароўя, дзе мы ў рэжыме відэаканферэнцыі праводзім планёркі з усімі галоўнымі ўрачамі Мінска, каб хутка і аператыўна вырашаць тыя пытанні, якія сёння ўзнікаюць. Мы стараемся, каб усе меры, якія звязаны з пандэміяй, былі эфектыўныя і давалі вынік. Самае галоўнае — захаваць жыцці нашых людзей і абараніць медыкаў», — сказала Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама нагадала, што нядаўна ў Беларусь прыязджалі эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Яны ўхвалілі меры, што прымаюцца ў краіне па барацьбе з COVID-19.

Асобна спікер закранула супрацоўніцтва Беларусі і ПРААН у галіне ўстойлівага развіцця. «Я проста ўпэўненая, што ў нас з вамі будуць складвацца цудоўныя адносіны пры вырашэнні гэтых задач і рэалізацыі праграм, якія запланаваны ў рамках Мэт устойлівага развіцця», — дадала Наталля Качанава.

Па матэрыялах БелТА.

УЛАСНЫ БОЛЬ І ТРАГЕДЫЯ КРАІНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

4 мая 1986 года было прынята рашэнне аб эвакуацыі жыхароў з 50 населеных пунктаў Брагінскага, Хойніцкага, Нараўлянскага раёнаў. На першым этапе ў самыя кароткія тэрміны эвакуацыя была праведзена цалкам з 30-кіламетровай зоны вакол станцыі. Уявіце, колькі людзей трэба было выселіць, а некаторых яшчэ і ўгаварыць! Многія, зразумела, не хацелі з'язджаць, бо неабходна было пакінуць усё. Як успамінаюць старыя, ім абяцалі, што пераезд будзе толькі на некалькі дзён або месяцаў. Але, вядома, адбылося іначай.

Нашы бацькі ў той час заставаліся на забруджанай зямлі і працавалі. Вайскоўцы і мясцовыя жыхары мылі будынкі, дзесьці здымалі грунт, мянялі шыфер.

Праз нейкі час нас з сястрой бацькі забралі дамоў. Гэта толькі мая невялікая гісторыя. Драматызм чарнобыльскай катастрофы ў тым, што яна непапраўна і на доўгі час змяніла жыцці тысяч сем'яў.

— З якімі праблемамі (акрамя экалагічных) пасля катастрофы сутыкнуліся пацярпелыя раёны?

— У тыя гады пачаў узнікаць недахоп кадраў. Напрыклад, Хойніцкі раён дынамічна развіваўся, было шмат прамысловых, сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Пасля чарнобыльскай трагедыі было адселена 22 тысячы з 45 600 чалавек. Уявіце, колькі засталося пустуючых аб'ектаў, жылля. Гэта падарвала кадравую палітыку раёна. Трэба было думаць пра тое, як далей жыць. Дзяржава прыняла правільнае рашэнне — стварыць праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. У 2020 годзе заканчваецца рэалізацыя пятай праграмы. У першай прадугледжваліся мерапрыемствы, якія дазволілі зразумець, што адбываецца на гэтых тэрыторыях, абараніць насельніцтва ад наступстваў. Будавалі жылыя дамы для перасялення грамадзян, асфальтавалі дарогі, адбывалася перазалужэнне паш для жывёлы і іншае. Дзяржаўныя праграмы дапамаглі людзям у першыя гады неяк сакумуліравацца. Я магу адзначыць, што ўжо ў 2000 годзе міграцыя насельніцтва ў Хойніцкім раёне амаль спынілася. З гэтага часу пачалася работа па забеспячэнні кадрамі. Дзякуючы гэтай жа праграме з'явілася магчымасць будаваць жыллё маладым спецыялістам, даваць ім выплаты і даплаты. Прадугледжаны льготны крэдыт пад тры працэнты для набыцця мэблі ў кватэру. Калі я пакідала раён і сваю пасаду, праблем у сацыяльнай сферы з кадрамі не было.

— Якія асаблівыя ўмовы створаны для тых, хто ўжо жыве на пацярпелых тэрыторыях?

— Больш за ўсё магчымасцяў у сацыяльнай абароне, медыцынскім забеспячэнні, санаторна-курортным аздараўленні. На гэтыя мерапрыемствы прадугледжваецца 56 працэнтаў ад сумы, выдаткаванай пад дзяржаўную праграму па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Ёсць выплаты для ліквідатараў аварыі. Насельніцтва, якое жыве ў асаблівых раёнах, раз на год праходзіць абавязковую дыспансерызацыю, медыцынскі агляд. Дзеці бясплатна аздараўляюцца ў санаторыях. Летась з усіх пацярпелых раёнаў такой магчымасцю скарысталася больш за 87 тысяч дзяцей. Вучні школ (а іх амаль 120 тысяч чалавек) атрымліваюць бясплатнае гарачае харчаванне. Праграма прадугледжвае і набыццё школьных аўтобусаў, абсталявання для харчовых блокаў. Для бальніц купляюцца апараты УГД, стаматалагічнае абсталяванне і іншае. З 2019 года ідзе рэканструкцыя Хойніцкай цэнтральнай раённай бальніцы, якая завершыцца налета. Будзе таксама весціся і пераабсталяванне. Наш раён заўсёды ўдзельнічаў у праектах, якія маглі прынесці дадатковае фінансаванне. Напрыклад, па праграме ўрада Японіі «Каранi травы» мы выйгралі два сучасныя медыцынскія апараты — відэабранхаскоп і відэакаланаскоп. Яны дазваляюць на ранніх стадыях выяўляць небяспечныя новаўтварэнні.

Для ўмацавання эканомікі раёна была праведзена мадэрнізацыя Палескага вытворчага ўчастка ААТ «Мілкавіта»: уведзена ў эксплуатацыю аўтаматызаваная лінія па вытворчасці і пасоле сыроў, пабудаваны цэх для выпрацоўкі сухой сыроваткі. Пяражыў рэканструкцыю Хойніцкі завод жалезабетонных вырабаў, што дазволіла не толькі вырабляць прадукцыю для жыллёвага і прамысловага будаўніцтва, але і сваімі сіламі займацца будаўніча-мантажнымі работамі. Гэта робіць таннейшым квадратны метр і зніжае сабекошт будаўніцтва жылля. Пераабсталявалі Хойніцкі завод гідраапаратуры і Хойніцкі лясгас.

— Як ідуць справы з земляробствам на гэтых тэрыторыях?

— За кошт вышэйназванай праграмы пабудаваны новыя малочнатаварныя комплексы, набываюцца мінеральныя ўгнаенні, якія дазваляюць знізіць узровень радыяцыі ў глебе і атрымліваць бяспечную прадукцыю. Да гэтага ж адносіцца пытанне вапнавання глебы. Пастаянна бяруцца пробы зямлі па пэўнай схеме, на розных палях. Для сельскай гаспадаркі набываецца спецыяльная камп'ютарызаваная тэхніка новага пакалення, якая дазваляе пазбягаць пылу ў кабіне і больш дбайна працаваць на гэтых тэрыторыях. Для хатняй жывёлы былі перазалужаныя пашы, падбіраліся навукоўцамі тыя расліны, якія мала або ўвогуле не назапашваюць радыенукліды. Таму вырошчваецца шмат рапсу, кукурузы.

У першыя гады пасля трагедыі адназначна ніякія грыбы і ягады нават не думалі збіраць, разумеючы, што ўзровень забруджвання вялікі. Пачалі займацца гэтым апошнія гадоў 5–10. Раней амаль усе дары лесу і сваю садавіну, агародніну неслі ў лабараторыі на бясплатную праверку. Цяпер такіх выпадкаў менш. Жыхары, што ходзяць у лес, ведаюць, якія грыбы назапашваюць радыяцыю, якія не. Нашы лабараторыі і санэпідэмстанцыі раёнаў адбіраюць пробы вады ў калодзежах, малака ў насельніцтва. Ёсць пэўныя пункты ў рэгіёнах, дзе робяцца заборы паветра. На тэрыторыі Хойніцкага, Брагінскага, Нараўлянскага раёнаў знаходзіцца Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік, і там ужо больш сур'ёзныя лабараторыі бяруць пробы драўніны, грунту — назіраюць, ці ёсць змяненні, якая драўніна або расліна назапашвае больш радыенебяспечных рэчываў, такая ж работа вядзецца з парэшткамі дзікіх жывёл. Пакуль я працавала ў раёне, шмат вучоных з усяго свету былі на тэрыторыі нашага запаведніка. Вахтавым метадам на працягу многіх гадоў працуюць там беларускія навукоўцы.

— З якімі асаблівымі праблемамі да вас сёння як да дэпутата парламента звяртаюцца жыхары пацярпелых раёнаў?

— Спецыфічных запытаў, звязаных з чарнобыльскай тэматыкай, няма. У асноўным хвалююць жыхароў праблемы надзённыя, напрыклад працаўладкаванне. Камусьці неабходна новая дарога, дзіцячая пляцоўка, лаўка, тратуар. Шмат звяртаюцца з пытаннямі па мацярынскім капітале. Задаюць нават пытанні, чаму шмат рэкламы на тэлебачанні, цікавяцца, чым займаюцца дэпутаты, якія заканадаўчыя акты разглядаюцца.

— Ці ёсць цяпер у распрацоўцы Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы заканадаўчыя акты, звязаныя з чарнобыльскай праблематыкай?

— Зараз такіх нарматыўна-прававых актаў няма. Але я хачу яшчэ раз звярнуць увагу на Дзяржаўную праграму па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Сёння распрацоўваецца новая, шостая праграма на 2021–2025 гады. Уносяцца прапановы па ёй, дэпартамент па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях акумуліруе іх. На працягу многіх гадоў задачы праграм застаюцца нязменныя — у галіне медыцыны, сацыяльнай абароны, радыяцыйнай абароны, сацыяльна-эканамічнага развіцця раёнаў. Напрыклад, мы запрашаем маладых спецыялістаў і павінны іх забяспечыць жыллём. Калі браць Хойніцкі раён, там штогод будуецца адзін дом з аднапакаёвымі, двухпакаёвымі кватэрамі для маладых спецыялістаў. Акрамя таго, калі работнік заключае кантракт на пяць гадоў, то яму выплачваюць 200 базавых велічынь, па другім пяцігадовым кантракце — 300 базавых велічынь. На сёння гэта дапамагае замацаваць маладых спецыялістаў на месцах. Замацаванасць у нас у межах 75 працэнтаў.

— Дэпутацкі корпус нейкім чынам прыцягваецца да работы над праграмамі па пераадоленні наступстваў катастрофы?

— Праграму распрацоўвае дэпартамент па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Але я прысутнічала на пасяджэнні па падвядзенні вынікаў у 2019 годзе ў дэпартаменце. Калі пыталіся пра прапановы ў новую праграму, я выступіла з меркаваннем наконт павелічэння турыстычнага складніка на тэрыторыі Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. Ёсць вялікая колькасць ахвотных туды трапіць, паглядзець на раслінны і жывёльны свет. За кошт таго, што з гэтых тэрыторый сышлі людзі, там флора і фаўна вельмі дынамічна і незвычайна развіваюцца. Напрыклад, ёсць беларуская архідэя, яе называюць венерын чаравічак, — на тэрыторыі нашага раёна яна была поўнасцю знішчана. Цяпер кветку знаходзяць у шматлікіх месцах — гэта сведчыць пра тое, што прырода адраджаецца. Тое ж адбываецца і з жывёльным светам: і зубры, і коні Пржавальскага, і рысі, і алені выдатна адчуваюць сябе там. Ёсць чырванакніжныя птушкі. Ніхто ніколі не бачыў, як жыве чорны бусел. А там гэтых птушак шмат.

Магчыма, работа з турыстамі будзе распрацоўвацца наступным чынам. Спецыяліст запаведніка забірае невялікую групу людзей, паказвае прыроду і з'язджае разам з наведвальнікамі, бо там заставацца нельга. Там і супрацоўнікі запаведніка не жывуць, а прыязджаюць на дзень або працуюць вахтавым метадам. Развіццё такога турыстычнага складніка будзе для Хойніцкага і іншых раёнаў спрыяць сацыяльна-эканамічнаму развіццю, падцягне гасцінічны, сувенірны бізнес.

Апроч таго, за гэтыя гады шмат матэрыялу напрацавала навука. Такой тэрыторыі ў свеце няма больш нідзе, а мы крыху спазняемся з падрыхтоўкай разнастайных матэрыялаў на аснове гэтай работы. Была прапанова: праз дзяржаўныя праграмы ці іншыя крыніцы заняцца выданнем навуковых і адукацыйных матэрыялаў. Яны могуць дапамагчы камусьці пераадолець падобныя праблемы. Свет не застрахаваны цяпер ні ад чога. Напрыклад, зусім нядаўна адбылася трагедыя на Фукусіме. Дарэчы, японскія спецыялісты ўжо прыязджалі да нас, і мы дзяліліся сваім вопытам.

— Якім чынам магчыма будзе трапіць у складзе турыстычнай групы ў запаведнік?

— Гэта можна зрабіць праз сайт. Кароткатэрміновая паездка не прынясе шмат праблем. Там ужо не адзін раз былі СМІ і блогеры Расійскай Федэрацыі. Адзіная нязручнасць — што частка тэрыторыі запаведніка адносіцца да прыгранічнай тэрыторыі, таму трэба атрымліваць дазвол ад пагранічнікаў. З гэтым яшчэ неабходна вырашаць, цяпер пытанне разглядаецца.

— Працягваючы тэму турызму: як вы асабіста адносіцеся да экскурсій у горад Прыпяць, чарнобыльскія закрытыя раёны? Ці трэба прапаноўваць такія маршруты?

— Я мяркую, што так. Гэта магчымасці для суседніх, пацярпелых ад катастрофы, але не адселеных раёнаў для развіцця. Вось кажуць, што на Украіне стапталі ўсе шляхі і ездзяць туды ўсе, хто пажадае. У нас так не будзе. Усіх ахвотных у Палескі запаведнік не пусцяць, але для арганізаваных груп — калі ласка. Калі такая турыстычная тэма будзе прапанавана МНС і пададзена для замацавання ў заканадаўства, я буду адназначна «за».

— Чарнобыльская праблематыка апошнім часам вельмі цікавая замежнаму турысту. Пэўную ролю ў гэтым сыграла і тэлебачанне — вядомы амерыкана-англійскі серыял «Чарнобыль», які ўзяў шмат кінапрэмій. Вы яго глядзелі? Якія вашы ўражанні?

— Так, глядзела. Увогуле ўсё досыць дакументальна і натуральна: ад адзення, мэблі, транспарту да абстаноўкі. Але мне не хапіла нейкай душэўнай ноткі, таго, што перажыла я, іншыя людзі, — калі вас здымаюць з роднага месца і звозяць. Было неяк дакументальна-адасоблена. Але фільм усё ж такі ўразіў сваёй натуральнасцю, крануў.

Марыя ДАДАЛКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КРОКІ ДА РАДЫЕБЯСПЕКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

РАДЫЕАКТЫЎНАЕ ЗАБРУДЖВАННЕ ТЭРЫТОРЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЦЭЗІЕМ-137 ПАСЛЯ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ КАТАСТРОФЫ



Па словах **Аляксандра НІКІЦІНА, загадчыка лабараторыі радыеэкалогіі ДНУ «Інстытут радыебіялогіі НАН Беларусі»,** кандыдата сельскагаспадарчых навук, сёння да радыеактыўна забруджаных зямель адносіцца 13,4 % плошчы краіны. Асноўная іх доля засяроджана ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях.

Забруджаныя ізатопамі плутонію і амерыцыем-241 землі знаходзяцца пераважна ў межах Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. На астатняй тэрыторыі радыенукліды складаюцца галоўным чынам з цэзію-137 і стронцыю-90. Перыяд паўраспаду абодвух ізатопаў складае каля 30 гадоў. З 1986 года плошча тэрыторыі, забруджанай цэзіем, паменшылася ў 1,7 раза, а стронцыем — у 1,9 раза.

Змяншаецца і плошча зямель, якія адносяцца да радыяцыйна небяспечных (яны не могуць выкарыстоўвацца для вядзення сельскай ці лясной гаспадаркі). Але адбываецца гэта не аўтаматычна ўслед за распадам радыеактыўных ізатопаў: перад вяртаннем зямель у гаспадарчы абарот праводзіцца іх абследаванне, ацэньваецца, наколькі бяспечна людзям працаваць на гэтых участках, якая будзе якасць вырабленай прадукцыі.

Вярнуць зямлю ў абарот

За постчарнобыльскі перыяд у гаспадарчае карыстанне было вернута каля 19 тысяч гектараў зямель. Пры гэтым, як адзначае **загадчык лабараторыі аграэкалогіі Інстытута радыебіялогіі НАН Беларусі, кандыдат сельскагаспадарчых навук Галіна СЕДУКОВА,** частка такіх зямель мае абмежаванае гаспадарчае выкарыстанне — на іх магчыма толькі вырошчванне асобных культур для вытворчасці кармоў ці на тэхнічныя мэты.

Супрацоўнікі Інстытута радыебіялогіі дасканала апісалі гэтыя тэрыторыі (вызначылі іх канкрэтныя межы, прыналежнасць да пэўных ведамстваў ды арганізацый і г. д.), ацанілі культурна-тэхнічны стан і радыяцыйнае становішча радыяцыйна небяспечных зямель, якія знаходзяцца на балансе сельскагаспадарчых арганізацый і райвыканкамаў, сфарміравалі базу даных адчужаных зямель, распрацавалі інструментарый па іх уліку. Апошні выкарыстоўваецца для прыняцця адказнымі ведамствамі і арганізацыямі рашэнняў аб тым, як далей кіраваць землямі гэтай катэгорыі.

У цяперашні час плошча сельскагаспадарчых зямель Беларусі, забруджаных цэзіем-137, складае каля 865 тысяч гектараў, стронцыем-90 — 290 тысяч гектараў. На іх вядзецца аграрная вытворчасць. Каб рабіць гэта з максімальнай бяспекай для чалавека і жывёл, трэба было распрацаваць комплекс ахоўных мерапрыемстваў. Таму з 1986 года на забруджаных землях Інстытутам радыялогіі праводзіліся навуковыя даследаванні.

Так, было ўстаноўлена, што сярод сельскагаспадарчых культур збожжавыя назапашваюць радыенукліды менш, чым бабовыя і зернебабовыя, таму апошнія было рэкамендавана выключыць з севазваротаў. У сваю чаргу, сярод збожжавых колькасць стронцыю-90, напрыклад, будзе меншая ў зерні пшаніцы, чым у зерні ячменю і аўса.

На аснове даследаванняў былі распрацаваны Рэкамендацыі па вырошчванні шырокага спектру сельскагаспадарчых культур і Рэкамендацыі па вядзенні сельскагаспадарчай вытворчасці на тэрыторыі радыеактыўнага забруджання. Па словах Галіны Седуковай, дзякуючы сістэматычнаму выкананню сельскагаспадарчымі арганізацыямі ахоўных мерапрыемстваў, дзяржаўнай падтрымцы і фінансавай дапамозе атрымалася значна знізіць узроўні ўтрымання радыенуклідаў у сельскагаспадарчай прадукцыі і зменшыць да мінімуму аб'ёмы вытворчасці прадукцыі, якая не адпавядае нарматывам па ўтрыманні радыенуклідаў.

Пры гэтым і цяпер у некаторых найбольш забруджаных раёнах Гомельскай вобласці рэгіструюцца выпадкі перавышэння ўтрымання стронцыю-90 у збожжы на харчовыя мэты, кармах для буйной рагатай жывёлы.

Сёння вучоныя Інстытута радыебіялогіі ў сваіх даследаваннях актуалізуюць даныя пра формы знаходжання радыенуклідаў у глебе, заканамернасці змянення каэфіцыентаў іх пераходу ў расліны з цягам часу, тэхналагічныя прыёмы вырошчвання культур, распрацоўваюць меры па павышэнні ўрадлівасці глебы, якія забяспечваюць мінімальнае ўтрыманне цэзію-137 і стронцыю-90 у прадукцыі.

Вывучаюць яны і магчымасць вяртання бабовых культур і іх долі ў структуры пасеваў пры рознай шчыльнасці радыеактыўнага забруджвання глеб, а таксама эфектыўнасць вырошчвання на такіх тэрыторыях, напрыклад, соргавых культур (сорга цукровае, зерневае, сорга-суданкавы гібрыд, суданская трава), здольных сфарміраваць высокія ўраджаі зялёнай масы нават у засушлівых пагодна-кліматычных умовах.

Суніцы і шампіньёны супраць цэзію

Якія ж культурныя і дзікарослыя расліны і грыбы здольныя больш за іншыя назапашваць радыенукліды?

Па словах Аляксандра Нікіціна, сярод дзікарослых відаў даволі высокія каэфіцыенты пераходу цэзію-137 у прадстаўнікоў сямействаў бабовых, драсёнавых (шчаўе), верасовых (чарніцы, брусніцы, дурніцы, журавіны), грушанковых. Мала цэзію-137 назапашваюць фіялкавыя, а суніцы, ажыны, маліны, рабіны, каліны ўтрымліваюць адносна невялікія яго колькасці ў ягадах.

Да акумулятараў цэзію адносяцца некаторыя віды ядомых грыбоў, якія могуць назапасіць цэзій-137 вышэй за дапушчальны ўзровень нават на «чыстых» землях. Гэта гаркуха, махавік жоўта-буры (імшарнік, або казляк), рыжык, масляк асенні/позні, каўпак кольчаты (курачка), польскі грыб. Крыху менш назапашваюць радыенукліды ваўнянка, зялёнка, падгруздак чорны, падбярозавік. А найбольш небяспечныя ў гэтым плане грыб-парасон пярэсты, страчок звычайны, вешанка, шампіньён.

Як правіла, высокія каэфіцыенты пераходу маюць расліны, каранёвая сістэма якіх знаходзіцца ў верхніх слаях глебы, таму што цэзій-137 да гэтага часу пераважна сканцэнтраваны ў верхніх 5-10 сантыметрах. Калі ж карані знаходзяцца ніжэй, то і назапашванне радыенуклідаў змяншаецца. Але, заўважае вучоны, гэтая заканамернасць парушаецца на перааараных глебах, дзе небяспечнае рэчыва размяркоўваецца на глыбіню апрацоўкі.

Інтэнсіўнасць назапашвання радыенуклідаў раслінамі вызначаецца не толькі відавымі асаблівасцямі, але і ўмовамі росту, а таксама хімічнымі ўласцівасцямі радыеізатопа. Як правіла, у вільготных умовах росту каэфіцыенты пераходу радыенуклідаў у расліны прыкметна вышэйшыя. Акрамя таго, накапленне іх у раслінах і грыбах залежыць ад умоў надвор'я ў вегетацыйны сезон.

Радыяцыя пад кантролем

Важнай часткай дзейнасці па забеспячэнні радыяцыйнай бяспекі ў краіне, у тым ліку на ўжо забруджаных тэрыторыях, з'яўляецца і радыяцыйны маніторынг.

— Сёння сетка пунктаў назірання радыяцыйнага маніторынгу Белгідрамета ў асноўным арыентавана на ранняе выяўленне павышаных узроўняў радыяцыйнага забруджвання з прычыны аварый на радыяцыйна і ядзерна небяспечных аб'ектах, — расказвае Міхаіл Каваленка.

Так, у перыяд пасля аварыі на ЧАЭС падчас маніторынгу атмасфернага паветра было зафіксавана тры выпадкі нязначнага павышэння ўзроўню радыяцыйнага забруджвання атмасфернага паветра: у сакавіку 2011 года — пасля аварыі на АЭС «Фукусіма»; у красавіку—жніўні 2015 года — пасля буйных пажараў у зоне адчужэння Чарнобыльскай АЭС; а таксама ў кастрычніку 2017 года (яго крыніца невядомая).

Вынікі радыяцыйнага маніторынгу перадаваліся ў МНС і Мінздароўя. Міністэрства аховы здароўя правяло разлік доз апрамянення насельніцтва, вынікі якога паказалі: дозы апрамянення, разлічаныя для крытычнай групы насельніцтва (дзяцей), не з'яўляюцца пагрозай для здароўя насельніцтва і не патрабуюць правядзення ахоўных мерапрыемстваў.

Радыяцыйны маніторынг паверхневых вод праводзіцца на пунктах назірання, размешчаных на шасці рэках Беларусі, што працякаюць па радыяцыйна забруджаных тэрыторыях. Паводле яго вынікаў, сярэднегадавыя канцэнтрацыі цэзію-137 і стронцыю-90 у вадзе асноўных кантраляваных рэк Гомельскай вобласці цяпер значна ніжэйшыя за рэферэнтныя ўзроўні для пітной вады. Тым не менш яны ўсё яшчэ перавышаюць значэнні, якія назіраліся да аварыі на ЧАЭС. Трансгранічны перанос радыенуклідаў водным шляхам не зафіксаваны.

Стабілізуюцца і колькасныя параметры вертыкальнай міграцыі радыенуклідаў у глебах. Па словах Міхаіла Каваленкі, лінейныя хуткасці перасоўвання цэзія-137 у розных тыпах глеб практычна зраўняліся і складаюць 0,20–0,35 см/год, у стронцыю ж яны крыху вышэйшыя (0,41–0,44 см/год), што абумоўлівае большую глыбіню яго пранікнення.

* * *

Па разліках спецыялістаў, да 2046 года радыяцыйна забруджаныя застануцца не больш за 10 % зямель. А гэта значыць, што з цягам часу да тэрыторый, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС, якія сёння ўжо выкарыстоўваюцца, пры выкананні ахоўных мер можна будзе далучыць дадатковыя землі, што паўплывае на павышэнне эканамічнага развіцця тэрыторый, якія трапілі пад радыеактыўнае забруджванне.

Вераніка КОЛАСАВА.

Яўгена ПЯСЕЦКАГА
фота слова

Час, калі след чарнобыльскай атруты палёг на гарады і вёскі, веснавыя палеткі, лясныя абшары, назаўжды застаўся ў памяці, захаваўся ў непрадузятых дакументах і фотаздымках. Сёння я перагортваю старонкі свайго даўняга зборніка «Кола дзён» з фота і вершамі, параўноўваю не толькі знешнасць, але і сутнасць з'яў, падзеленых больш чым трыццаццю гадамі. Цяпер ужо не адшукаць тую палявую сцежку, перагароджаную знакам радыяцыйнай небяспекі. Вакол таго поля вырас новы гай. Жыццё сцвярджае свае спрадвечныя законы. Кола нашых дзён — няспыннае.

Над полем маім то сонца, то месяц.
На полі маім то кветкі, то снег.
Бывае імгненне бясконцым як вечнасць,
Бывае — імгненнем праносіцца век.

Было, наляцелі атрутныя хмары,
Пабляклі валошкі — у снах не сасніць.
У чорнай жалобе аціхлі абшары,
І нельга было на сцяжынку ступіць.

Усё гэта поле пазнала, стрывала,
Яго хмызнякам забыцця не скарыць.
Жыццё захавала ў атрутнай навале —
Жыве маё поле, і я буду жыць.

На хвалі

ТАЛЕНТАЎ МЕНШ НЕ СТАЛА

IX Рэспубліканскі творчы радыёконкурс «Маладыя таленты Беларусі», галоўнай тэмай якога сёлета стала 75-годдзе Вялікай Перамогі, набліжаецца да свайго фіналу.

На адрас арганізатараў творчага спаборніцтва паступіла каля 400 заявак. З іх у другі тур дапушчаны былі 243 канкурсанты, а ў трэці — 157 удзельнікаў. Істотнай акалічнасцю стала тое, што праслухоўванні ўпершыню праводзіліся дыстанцыйна, але з максімальнай набліжанасцю да ўмоў жывога. Па выніках трэцяга тура прафесійнае журы на чале са старшынёй — народным артыстам Беларусі Леанідам Захлеўным — вызначыць фіналістаў да 24 красавіка. Завяршальны тур конкурсу, які звычайна праходзіў у Вялікай студыі Дома радыё, з-за эпідэміялагічнай абстаноўкі зрабілі таксама дыстанцыйным — па відэазапісах.

— Нягледзячы на абставіны, якія склаліся, мы атрымалі амаль такую ж колькасць заявак, як і ў мінулым годзе. Гэта сведчыць пра тое, што нам давяраюць, і конкурс з'яўляецца адным з самых прэстыжных рэспубліканскіх спаборніцтваў у нашай краіне. І, напэўна, у гэтым самае моцнае ўражанне. Безумоўна, сённяшняя сітуацыя зрабіла і адмоўны ўплыў на ход спаборніцтва: мы былі вымушаныя спачатку другі, а потым і трэці тур правесці дыстанцыйна, у выніку журы не адчувае жывой энергіі канкурсантаў. Але ёсць і станоўчы момант — у тым, што журы можа вярнуцца да прадстаўленых запісаў, параўнаць іх. Бо раней, вядома, ярчэй запаміналіся тыя ўдзельнікі, каго чулі бліжэй да фіналу праслухоўвання. Я думаю, што на аб'ектыўнасць вынікаў паўплывае менавіта гэтая магчымасць перагледзець і параўнаць. Узровень падрыхтоўкі кожны год застаецца стабільна высокім і канкурэнцыя вялікая, — адзначае **кіраўнік і аўтар праекта «Маладыя таленты Беларусі» Таццяна ЯКУШАВА.** — Удзельнікам на будучыню магу сказаць: раскрывайце сябе, заставайцеся асобамі, шукайце спосабы прадэманстраваць свае таленты і здольнасці. Бо калі чалавек — асоба, то зможа на любым інструменце і ў выкананні любога твора паказаць майстэрства і прафесіяналізм.

Нагадаем, што навіны і падрабязнасці конкурсу вы можаце знайсці на сайце Першага нацыянальнага канала беларускага радыё www.radio1.by, а таксама на афіцыйных старонках канала ў сацыяльных сетках. А ў радыёэфіры пра ход і вынікі конкурсу кожную нядзелю ў 09.05 расказвае аднайменная праграма «Маладыя таленты Беларусі». Тут жа прагучаць і музычныя творы ў выкананні пераможцаў і ўладальнікаў спецыяльных прызоў сёлетняга спаборніцтва.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 112

Сёння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

№ 35



№ 35

Белыя простыя шашкі: c1, e1, f4, e5, g5, c7, белыя дамкі: g3 (7)

Чорныя простыя шашкі: c3, b4, a5, c5, h6, g7, чорныя дамкі: a1, b8 (8).

№ 36

Белыя простыя шашкі: h2, b6, d6, f6 (4).

Чорныя простыя шашкі: g3, b4, d4, f4, h4, a7 (6).

№ 37

Белыя простыя шашкі: 38, 39, 40, 31, 33, 34 (6).

Чорныя простыя шашкі: 26, 23, 25, 20, 8, 9, 10 (7).

№ 38

Белыя простыя шашкі: 37, 39, 31, 32, 27, 28, 30, 25, 16 (9).

Чорныя простыя шашкі: 34, 26, 21, 17, 18, 14, 15, 6, 8 (9).

Дзве наступныя пазіцыі, складзеныя па правілах бразільскіх шашак.

№ 39

Белыя простыя шашкі: e5, d6, c7, белыя дамкі: h6 (4)

Чорныя простыя шашкі: c3, h4, g7, b8, f8 (5).

№ 40

Белыя простыя шашкі: g1, h2, e5, f6, h6, g7 (6).

Чорныя простыя шашкі: b2, d2, b4, c5, c7, h8 (6).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія першыя дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 111 ад 10.04.20.

№ 32 1. c3-b4 a5:c3 2. g3-f4 e5:g3 3. d4-e5 f6:d4 4. e3-f4 g3:e5 5. f2-e3 d4:f2 6. b2:a5+

№ 33 1. c5-d6 c7:e5 2. a5:c7 d8:b6 3. d4-c5 b6:d4 4. b4-a5+

№ 34 1. c5-d6 c7:e5 2. a5:c7 b8:d6 3. d4-c5 a7-b6 4. c5:a7+

Пазіцыі Д. Яраша спадабаліся нашым чытачам. Вось адзін з водгукаў, што даслаў Фёдар Карпей з Мядзела: «Дзякую нашаму ўкраінскаму аўтару за творчасць! Было цікава рашаць!»

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі (Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён).

Анонс: штодня ў 20:30 на гульнявым сайце https://www.playok.com/ru праводзяцца анлайн-турніры па рускіх шашках (арганізатар belarusdr, кантроль часу 3 хвіліны плюс 2 секунды, 7 тураў). Да ўдзелу запрашаюцца ўсе ахвотныя.

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск, 220013.

E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

З КІМ РАНІЦУ ПАЧНЕШ...

Дзмітрый Церахаў стаў часткай каманды «Нашай раніцы» на АНТ у пачатку года, і вось ужо працяглы час ён у пары з Таццянай Рудакоўскай настройвае гледачоў на сустрэчу новага дня. «Звязда» распытала ў вядучага, чым ён жыве па-за эфірам, а заадно вырашыла пазнаёміць нашых чытачоў з ім бліжэй.

Дзмітрый прыйшоў на тэлеканал АНТ пасля адбору, які тут ладзілі летась у некалькі этапаў. Сярод прэтэндэнтаў было 300 чалавек, аднак менавіта на асобе гэтага маладога чалавека спыніла свой выбар фокус-група на фінальным этапе. Сам вядучы згадвае:

— Прайсці кастынг было не самым складаным, але хваляванне прысутнічала. Адбор ладзілі ў тры этапы: знаёмства, запісы пілотаў розных праграм і трэці этап, калі выбіралі ўжо з некалькіх чалавек. Я на фінал прыехаў крыху прастуджаны, і мне здавалася, быццам нешта не так складваецца, але ў выніку пачуў: «Рыхтуйцеся да эфіру 14 студзеня».

Сумесна таксама разглядаем пытанні ўзаемадзеяння сельсаветаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў па развіцці населеных пунктаў. Разам шукаем шляхі захавання і развіцця традыцыйных рамёстваў, фарміравання духоўнаманальнага патэнцыялу насельніцтва, турыстычнай прывабнасці рэгіёнаў, эфектыўнага выкарыстання мясцовых рэсурсаў, развіцця малога прадпрымальніцтва і арганізацыі самазанятасці насельніцтва, працаўладкавання грамадзян і іншыя.

— Тэматыка вашых сустрэч актуальная для жыхароў у кожнага раёна. Калі ласка, прывядзіце прыклад вырашэння нейкага праблемнага пытання, характэрнага для ўсёй вобласці, пасля падобнай сустрэчы.

— Так, летась па выніках выязнога пасяджэння ў Лоеўскім раёне па тэме прывядзення ў належны стан месцаў пахавання, што знаходзяцца ў сельскай мясцовасці, пастаяннай камісіяй абласнога Савета па аграрных пытаннях, экалогіі і праблемах пераадолення наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС быў рэалізаваны пілотны праект. Размова ідзе пра рэгістрацыю прававой сельвыканкамаў на зямельныя ўчасткі, занятыя грамадзянскімі могілкамі, з мінімальнымі выдаткамі. Ліквідаваны прававыя перашкоды для фінансавання мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні месцаў пахавання. Рэгламент дзеянняў па рэгістрацыі накіраваны ўсім райвыканкамам для рэалізацыі на месцах.

Вырашаны і іншыя шматлікія пытанні, якія ўзнімалі жыхары раёнаў: добраўпарадкаванне, утрыманне дарог, вуліц сельскіх населеных пунктаў, установка кантэйнерных пляцовак для збору смецця, рамонт спартыўных гульнявых пляцовак.

Нарэшце, адзначу, што сёлета актыўна працягваецца рэалізацыя мерапрыемстваў Дзяржпраграмы ЧАЭС. На кантролі работы па радыяцыйнай абароне насельніцтва павышэнне эфектыўнасці адраснай спецыялізаванай медыцынскай дапамогі, а таксама паляпшэнне якасці і ўзроўню жыцця ў забруджаных радыенуклідамі раёнах.

ЖЫЦЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У раёне, які мяжуе з чарнобыльскай зонай адчужэння, людзі думаюць пра далейшае развіццё родных мясцін.

СЁЛЕТА жыхары менш чым трох тысяч вясковых двароў Хойніцкага раёна ў складчыну добраахвотна сабралі 7 тысяч рублёў. Гэта сур'ёзны фінансавы ўнёсак у добраўпарадкаванне роднай зямлі. Людзі таксама актыўна дапамагаюць наводзіць парадак на вясковых могілках, месцах агульнага карыстання, робяць прывабнымі ўласныя сядзібы. Павагу выклікае вялікае жаданне старэйшага пакалення і моладзі захаваць памяць пра родныя мясціны. Таму яны разам з дэпутатамі абнаўляюць памятныя знакі героям Вялікай Айчыннай, усталёўваюць новыя прыгожыя паклонныя крыжы ў вёсках, добраўпарадкоўваюць грамадзянскія могілкі.

Нядаўна пераможцам абласнога конкурсу сярод найлепшых гарадскіх, пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў абраны Барысаўшчынскі сельсавет Хойніцкага раёна. Ён прызнаны найлепшым у групе намінантаў з колькасцю насельніцтва ад 1,1 да 1,5 тысячы чалавек. Дыплом першай ступені прадугледжвае і грашовую прэмію 1500 базавых велічынь. Гэтая перамога — вынік плённай

Фота дадзена Хойніцкім раённым Саветам дэпутатаў.

сумеснай работы дэпутатаў і мясцовых жыхароў, лічаць у раённым Савеце дэпутатаў.

— Да ўдзелу ў конкурсе мы падрыхтавалі маляўнічы альбом-прэзентацыю, дзе расказалі пра гісторыю нашых мясцін, пра нашых людзей, — кажа **старшыня Барысаўшчынскага сельскага Савета дэпутатаў Алена СТАШКЕВІЧ.** — Праз фотасправаздачу імкнуліся абагульніць досвед нашых наглядальных камісій, расказаць пра мерапрыемствы па навядзенні парадку на зямлі. Традыцыйна мы праводзім грунтоўную работу па зносе старых пакінутых домаўладанняў. Адначасова наладжваем і сваю сістэму стымулявання малога прадпрымальніцтва на вёсцы, у прыватнасці, даём у арэнду аб'екты нерухомасці.

Алена Уладзіміраўна адзначае, што яе апошнім часам асабліва радуе актыўнасць вяскоўцаў па добраўпарадкаванні ўласных падворкаў і сядзіб: рамантуюць агароджы, ствараюць малыя архітэктурныя формы, разбіваюць клумбы.

Летась сіламі дэпутатаў і вясковых актывістаў у Барысаўшчыне адкрылі пляцоўку для адпачынку і заняткаў спортам. Грунтоўную падтрымку атрымалі ад народных абранцаў — дэпутатаў Хойніцкага райсавета, якія вылучаліся менавіта ад гэтых мясцовых акруг.

Алена Сташкевіч звяртае ўвагу і на новую сумесную гісторыка-патрыятычную ініцыятыву ў гэтым населенным пункце. Дэпутаты за ўласныя сродкі ўзводзяць мемарыяльны знак у памяць дзвюх соцень салдат-герояў, якія адсюль пайшлі на фронт і не вярнуліся. Гэта вельмі грунтоўны і надзвычай важны праект для выхавання дзяцей і моладзі.

Дарэчы, Барысаўшчынскі сельскі Савет вызначаецца ў Хойніцкім раёне не толькі ініцыятыўнымі жыхарамі, але і цікавасцю да гэтых мясцін з боку маладых сужэнцаў. Тут пасялілася мноства маладых шматдзетных сем'яў, якія самі абралі вёску замест горада.

— Мы ўсё робім для таго, каб нашы дзеці выраслі і засталіся на роднай зямлі, — кажа Алена Уладзіміраўна, — У нас шмат маладых сем'яў, якія падаюць заявы на будаўніцтва індывідуальных дамоў у нашым сельсавеце. Сёлета пяць з іх пачынаюць будавацца. Летась дзве сям'і пабудаваліся ўжо ў Барысаўшчыне і Храпкаве.

Многія сем'і разглядаюць пабудовы жылля на вёсцы ў тым ліку дзякуючы выкананню ў гэтай мясцовасці праграмы «Чыстая вада». Летась на тэрыторыі Хойніцкага раёна былі пабудаваны чатыры станцыі абезжалезвання.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ВОСТРАЎ ПАД НАЗВАЙ ЖУРАВЫ

Да Чарнобыля Журавы былі невялікай, усяго 56 двароў, каларытнай вёсачкай з саўгаснымі пабудовамі і кузняй пры дарозе. Людзі жылі дружна, разам спраўлялі вяселлі, расцілі дзяцей, праводзілі ў апошні шлях знаёмых і сваякоў. Звычайны рытм жыцця парушыла агульная бяда, якая атруціла гэтыя землі.

Вёска была выселена, а хаты амаль усе закапаны. Толькі двое старых адмовіліся пакідаць родную зямлю. Дзед рашыўся на пераезд толькі ў 2002 годзе, калі памерла яго жонка. І яшчэ адзін дом стаў месцам сустрэч для былых вяскоўцаў – як птушкі цягнуцца да сваіх родных гнёздаў, так і жураўцы не хочуць развітвацца са сваёй малой радзімай. Цікава, што амаль 60 % жыхароў былой вёскі таксама маюць красамоўнае прозвішча Жораў.

Уладзімір Жораў, які ў 1989 годзе разам з жонкай і двума сынамі, малодшаму з якіх тады было паўтара года, пераехаў у гарадскі пасёлак Глуск. Менавіта гэты чалавек натхніў былых жыхароў аб'яднацца і неяк ушанаваць родную вёску, бо тыя сустрэчы падчас Радаўніцы не маглі замяніць жывых стасункаў – кожны прыязджаў да сваіх памерлых, і пагутарыць за жыццё, як гэта было ў лепшыя часы, не атрымлівалася.

У гонар аднавяскоўцаў, якія не вярнуліся з Вялікай Айчыннай вайны.

Уладзімір ЖОРАЎ разам з сынам Андрэем.

З датай вызначыліся адразу – свята Івана Купалы, што адзначаецца ў ліпені. Раней вясковая моладзь у гэтую таямнічую ноч гуляла ад душы, – а такое не забываецца.

– У маей тэлефоннай кніжцы некалькі дзясяткаў прозвішчаў маіх землякоў, – усміхаецца Уладзімір Мікалаевіч. – Мы напярэдадні імкнёмся стэлефанавацца, але часцей за ўсё нікому пра гэта і нагадваць не трэба. Усе чакаюць сустрэчы. Прыязджаем у суботу і раз'язджаемся толькі на наступны дзень – у нядзелю. Мы нават спецыяльныя сталы і лаўкі зрабілі, каб сядзець разам. Шашлыкі смажым, шурпу робім, юшку – стол ломіцца ад рознай смакаты. Як і раней, ноч за нашымі размовамі пралятае непрыкметна. А днём ходзім па вёсцы, і кожны прыпыняецца там, дзе быў яго дом. Вельмі ўсё гэта балюча.

Летась на скрыжаванні вёскі, дзе раней вуліца раздзялялася на дзве – адна ішла прама, а другая ўбок – жураўцы ўстанавілі памятны камень з кранальным надпісам: «Вёска Журавы. Ты прабач, што цябе мы пакінулі...» І дата, калі з'ехаў апошні жыхар, Іван Жораў, –2002 год. На мерапрыемстве прысутнічалі раённыя ўлады, гучалі кранальныя словы пра агульную памяць і любоў да родных мясцін.

Гэты камень стаў другім знакам памяці любай сэрцу вёсачкі. Перад гэтым непадалёк быў зроблены невялічкі пагорак і ўстаноўлены крыж, які асвяціў настаяцель Выдрынскай царквы айцец Віктар.

А сёлета Уладзімір Жораў нарэшце выканаў загад свайго бацькі Мікалая Макаравіча, ушанаваў памяць загінулых на вайне землякоў. Бацька казаў пра гэта яшчэ да Чарнобыля, а потым памёр. Сын спачатку абышоў старажылаў, каб занатаваць прозвішчы. І адзін з іх, Міхаіл Васільеў, які добра ведаў усіх тых герояў, паймённа пералічыў прозвішчы і імёны 42 чалавек. Калі Уладзімір Жораў звяраў гэты спіс з ваенкаматам, то высветлілася, што стары ніводнай памылкі не зрабіў.

Некалькі гадоў таму Уладзімір Мікалаевіч падняў пытанне захавання памяці землякоў на чарговай сустрэчы. І землякі яго падтрымалі. Пранікнёныя словы для жураўцаў, якія не вярнуліся з вайны, напісаў вядомы журналіст Навум Сандамірскі.

– Мы думалі ўстанавіць гэты помнік на 9 мая, але пабаяліся, што з-за каранавіруса свята перанясуць, – кажа суразмоўца. – Таму ў пазамінулую суботу мы яго ўжо паставілі на нашай вясковай пляцоўцы, непадалёк ад крыжа і каменя ў гонар вёскі. А заадно ўстанавілі яшчэ адзін памятны знак, дзе схематычна абазначылі нашу вёску. Мастак Валерый Васілеўскі з двух фота зрабіў карцінку, на якой кожны жыхар цяпер з лёгкасцю пазнае мілы сэрцу родны кут. Пад малюнкам напісана: «Вёска Журавы. Астравок памяці».

У тым, што яна будзе доўгая, Уладзімір Жораў не сумняваецца. Бо ў справу ўключылася ўжо і моладзь. З дастаўкай помнікаў дапамаглі яму сыны Андрэй і Дзмітрый, якія хоць і не паспелі ўлюбіцца ў вёску так, як іх бацька, але ж там нарадзіліся. Гэтыя знакі далёка відаць з дарогі. Цяпер кожны, хто будзе праязджаць па трасе Краснаполле – Гомель, зможа прыпыніцца і пачытаць, што тут калісьці была прыгожая вёска пад не менш паэтычнай назвай Журавы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з дамашняга архіва Уладзіміра ЖОРАВА.
Краснапольскі раён.

❍ Каментарый у тэму

Анжаліка ГОМАН, старшыня Краснапольскага райсавета дэпутатаў:

– У выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС на тэрыторыі раёна спынілі сваё існаванне 83 вёскі. Але выпадак з вёскай Журавы, калі самі жыхары ўшаноўваюць памяць вёскі, адзінкавы. У нас была задума паставіць на месцы выселеных вёсак памятныя знакі, але пакуль яе рэалізаваць не атрымалася. Жыхары Журавоў паказалі вельмі прыгожы прыклад. Першапачаткова яны ўстанавілі памятны знак, а цяпер, у 75-ю гадавіну Вялікай Перамогі, ушанавалі памяць сваіх землякоў, якія не вярнуліся з вайны. Я вельмі ўдзячная гэтым людзям за іх любоў за малой радзімы. Яны прыязджаюць сюды штогод, прычым цэлымі сем'ямі – з унукамі і дзецьмі. Такая памяць – самая што ні на ёсць сапраўдная.

PARITETBANK

Открытое акционерное общество «Паритетбанк»
(Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а)
сообщает, что 15 мая 2020 г. в 11.00
в соответствии с решением
Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк»
состоится внеочередное общее собрание акционеров
в очной форме по адресу:
Оздоровительный комплекс «Ислочь-Парк»,
Республика Беларусь, Минская область, Воложинский район,
Раковский сельсовет 24, 1.8 км западнее а. г. Раков
(координаты: 53.980192, 27.014902)

Повестка дня:

1. О досрочном прекращении полномочий Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк».
2. О выборах нового состава Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, составляется на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на 23 апреля 2020 г.

Лица, имеющие право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, могут ознакомиться с информацией (документами) по вопросам повестки дня 13–14 мая 2020 г. с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Киселёва, 61а, каб. 306 либо 15 мая 2020 г. по месту проведения внеочередного общего собрания акционеров при прохождении регистрации.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, будет проводиться 15 мая 2020 г. по месту проведения внеочередного общего собрания акционеров с 10.20 до 10.50 часов при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Телефон для справок: 8 017 237 76 79.

Лыщицкий сельский исполнительный комитет
Брестского района Брестской области
ОБЪЯВЛЯЕТ ОБ ОТМЕНЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ
ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА
в Лыщицком сельском Совете Брестского района,
назначенного на 13 мая 2020 г.,
опубликованного в газете «Звязда» от 11.04.2020 г.

УНП 100289278

Открытое акционерное общество «Стройтрест № 35»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2019 год

тыс. руб.

АКТИВ	код строки	на 31.12.2019 г.	на 31.12.2018 г.	ПАССИВ	код строки	на 31.12.2019 г.	на 31.12.2018 г.
I. Долгосрочные активы				**III. Собственный капитал**			
Основные средства	110	21 129	14 027	Уставный капитал	410	11	11
Нематериальные активы	120	10	11	Резервный капитал	440	38	38
Вложения в долгосрочные активы	140	1 135	2 735	Добавочный капитал	450	13 463	12 751
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	99		Нераспределенная прибыль	460	23 607	18 978
Итого по разделу I	**190**	**22 373**	**16 773**	**Итого по разделу III**	**490**	**37 119**	**31 778**
II. Краткосрочные активы				**IV. Долгосрочные обязательства**			
Запасы	210	16 481	12 826	**Итого по разделу IV**	**590**	-	-
Расходы будущих периодов	230	140	143	**V. Краткосрочные обязательства**			
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	74	36	Краткосрочные кредиты и займы	610	5	550
Краткосрочная дебиторская задолженность	*250*	14 206	19 254	Краткосрочная кредиторская задолженность	630	29 605	26 720
Денежные средства	270	13 487	10 016	Резервы предстоящих платежей	640	32	-
Итого по разделу II	**290**	**44 388**	**42 275**	**Итого по разделу V**	**690**	**29 642**	**27 270**
БАЛАНС	**300**	**66 761**	**59 048**	**БАЛАНС**	**700**	**66 761**	**59 048**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2019 года	За январь – декабрь 2018 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	175043	140666
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(153516)	(122321)
Валовая прибыль	030	21527	18345
Управленческие расходы	040	(13760)	(10827)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	060	7767	7518
Прочие доходы по текущей деятельности	070	5183	2620
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(6622)	(3126)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	6328	7012
Доходы по инвестиционной деятельности	100	573	242
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(70)	(2)
Доходы по финансовой деятельности	120	14	57
Расходы по финансовой деятельности	130	(180)	(160)
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	140	337	137

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2019 года	За январь – декабрь 2018 года
1	2	3	4
Прибыль (убыток) до налогообложения	150	6665	7149
Налог на прибыль	160	(1317)	(1401)
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	0	0
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	6	5
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	210	5342	5743
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	738	895
Совокупная прибыль (убыток)	240	6080	6638

Аудиторское заключение от 16.03.2020 г. № 01-03/22

По мнению аудиторской организации ООО «МАиС Консалт Белстрой», годовая бухгалтерская отчетность ОАО «Стройтрест № 35» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Стройтрест № 35» на 31 декабря 2019 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансоваого положения в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

ПІЛЬНАСЦЬ, СВЯДОМАСЦЬ, ПРАФІЛАКТЫКА

Як працуюць сельскія ўстановы аховы здароўя Брэсцкай вобласці ва ўмовах пандэміі, расказвае карэспандэнт «МС»

Ачагі інфекцыі, як вядома, хутчэй узнікаюць у вялікіх гарадах, дзе шчыльнасць насельніцтва даволі высокая. У вёсках сітуацыя ў асноўным спакойная. Але ж пільнасць, павышаныя меры прафілактыкі ніхто не адмяняў, асабліва там, дзе жыве шмат сталых людзей, якія ў пэўнай ступені знаходзяцца ў групе рызыкі.

Лізавета НІЧЫПАРУК, фельчар Далкоўскага ФАПа Пружанскага раёна.

Пацыенты з групы рызыкі

З фельчарам Далкоўскага ФАПа Пружанскага раёна Лізаветай НІЧЫПАРУК давялося сустракацца ў самым пачатку гэтага года. Тады **старшыня Ружанскага сельскага савета Аксана ЮРКОЎСКАЯ** рэкамендавала медыка як аднаго з самых старанных і адказных маладых спецыялістаў. Справа ў тым, што Лізавета працуе тут першы год. Выпускніца Пінскага медыцынскага каледжа адразу ўнікла ў асаблівасці работы, яе ўважлівае стаўленне да пацыентаў ацанілі жыхары навакольных вёсак.

У зону абслугоўвання маладога фельчара ўваходзяць чатыры вёскі: Далкі, Загалічы, Бярэзніца і Паўлава. З амаль 500 чалавек насельніцтва прыблізна 300 складаюць пенсіянеры. І калі раней яны стараліся самі прыйсці на прыём у сельскі ФАП, то цяпер часцей карыстаюцца магчымасцю пракансультавацца па тэлефоне альбо выклікаць медыцынскага работніка на дом.

— Работа мая ў сувязі з пандэміяй мала ў чым змянілася, — разважае Лізавета Нічыпарук. — Хіба толькі павышаныя меры бяспекі выконваем падчас прыёму. Цяпер пры наведванні пацыентаў — абавязкова ў масцы і пальчатках, памяшканне медустановы апрацоўваем некалькі разоў на дзень (ФАП размяшчаецца ў прасторным драўляным доме з печкай. — **Аўт.**). Вядома, цяпер часцей выязджаю на дом да людзей, асабліва пажылых. Там бяру аналізы, нярэдка дастаўляю лекі. У нас жа няма валанцёраў, як у вялікіх гарадах, так што ў пэўным сэнсе нам даводзіцца імі быць.

І ведаеце, усяляе аптымізм тое, што мае бабулькі і дзядулькі вельмі паслухмяныя, можна сказаць, свядомыя пацыенты. Ім рэкамендавалі лішні раз не наведваць паліклініку ці ФАП — яны і не ходзяць. Нават адно з адным сталі менеў камунікаваць. Размаўляюць больш па тэлефоне. Хоць, здавалася б, для пажылых людзей вельмі важна ўбачыцца, абмеркаваць навіны. А яны, тым не менш, скарацілі свае стасункі і сумесныя пасядзелкі. Ведаюць, што гэта часова, таму адносяцца з разуменнем.

Пра часовасць гэтых мер Лізавета Нічыпарук гаварыла нядаўна са Стэфанідай Іванаўнай Зубеняй з Бярэзніцы. Жанчына 1931 года нараджэння жыве адна, сама сябе абслугоўвае, дома ў яе чысціня і парадак. Вядома, дзеці клапоцяцца, але ж і сама бабуля шмат чаго робіць. Адчула невялікае недамаганне — выклікала фельчара, за што тая яе пазней і пахваліла. Гэтым людзям часам не столькі таблеткі дапамагаюць, колькі словы спагады. Важна таксама, што большасць вясковых жыхароў прыслухоўваецца да парад медыка.

Пра тых, хто на каранціне

У Папінскім сельсавеце Драгічынскага раёна працуюць два ФАПы і ўрачэбная амбулаторыя. **Старшыня сельскага Савета Святлана ДЫШКО** ў размове адзначыла, што мясцовая ўлада ў цяперашніх умовах удзяляе шмат увагі інфармаванню насельніцтва.

— У нас на кожным інфармацыйным стэндзе, каля кожнага магазіна, ва ўстановах культуры змешчаны памяткі аб тым, як сябе паводзіць, каб зберагчы сваё здароўе, — кажа Святлана Дышко. — Усе мы — супрацоўнікі сельвыканкама, дэпутаты — праводзім гутаркі з людзьмі, нагадваем пра меры бяспекі. Пад асаблівым кантролем трымаем пытанне аб каранціне для асобных катэгорый грамадзян. Некаторыя жыхары вёсак працавалі ў Расіі, краінах Еўропы. Ёсць у нас будаўнікі, дальнабойшчыкі, якія ў сувязі з эпідэмічнай абстаноўкай тэрмінова вярнуліся дадому. Мы іх наведалі, азнаёмілі пад подпіс з дакументамі аб неабходнасці двухтыднёвай самаізаляцыі.

Варта сказаць, што большасць жыхароў вёсак сельсавета з разуменнем паставіліся да патрабаванняў: каранцінныя меры выконваюць, усе адчуваюць сябе добра, знаходзяцца пад наглядам медыкаў. Адзін чалавек, праўда, не вытрымаў знаходжання дома і аднойчы прыйшоў у сельскі магазін. Пра гэта адразу паступіў сігнал у сельсавет, яго прадстаўнікі наведалі грамадзяніна і вынеслі яму вымову за парушэнне.

— І гэта правільна: трэба папраўляць аднавяскоўцаў, калі яны не ўсведамляюць адказнасці за ўласныя паводзіны, — лічыць старшыня сельскага Савета.

Пра карысць абходаў

Фельчар Ляхавіцкага ФАПа, дэпутат Папінскага сельсавета Міхаіл ПАДОЛЬСКІ кажа, што асноўны змест яго работы заключаецца ў прафілактычных наведваннях пацыентаў па месцы пражывання. Міхаіл Міхайлавіч паходзіць з дынастыі медыкаў, у Ляхавіцкім ФАПе больш за 40 гадоў адпрацавала яго маці, якая і навучыла ведаць пра стан здароўя кожнага пацыента, быць для вяскоўцаў сямейным медыкам.

— У нас цяпер мала выклікаў. Але, каб наведаць умоўную Марыю Іванаўну, мне выклік не трэба, — расказвае Міхаіл Падольскі. — Я ведаю асаблівасці яе гіпертаніі, з перыядычнасцю, якую вызначаю сам у залежнасці ад гісторыі хваробы, прыязджаю. Калі трэба, накіроўваю да ўрача-спецыяліста ці на шпіталізацыю. І людзі ўжо даверяюць майму меркаванню. Цяпер мала што па сутнасці памянялася ў паўсядзённай рабоце фельчара. Так, больш, чым раней, нагадваю пра меры прафілактыкі, назіраю за тымі, хто знаходзіцца ў каранціне пасля прыезду з краін блізкага і далёкага замежжа.

> «Цяпер часцей выязджаю на дом да людзей, асабліва пажылых. Там бяру аналізы, нярэдка дастаўляю лекі. У нас жа няма валанцёраў, як у вялікіх гарадах, так што ў пэўным сэнсе нам даводзіцца імі быць».

Пра сезонны ўсплёск і паступовы спад

Павіццеўская амбулаторыя ўрача агульнай практыкі, што ў Кобрынскім раёне, працуе ў звычайным рэжыме. Яе ўнікальнасць хіба ў тым, што аддаленая вёска Павіцце адна ўтварае цэлы сельсавет і цэлы ўчастак для амбулаторыі. Прыблізна 1300 чалавек складаюць зону абслугоўвання **доктара Марыны ГЕЛЕМЕНТ.**

— Сёння на прыём зранку прыйшло няшмат людзей, — адзначае Марына Фёдараўна. — А вось у сакавіку ў нас быў усплёск прастудных захворванняў. Даўно такога не прыпомню, каб людзі ішлі літаральна адно за адным. На шчасце, гэтае сезоннае захворванне ў красавіку пайшло на спад. Цяпер хворых у калідорах паменела. Ды і шырокае інфармаванне насельніцтва адыграла ролю, людзі стараюцца заставацца дома, пры сімптомах хваробы выклікаюць урача. Таму па выкліках даводзіцца хадзіць крыху больш, а ў астатнім абстаноўка звычайная, — кажа доктар.

Дарэчы, у вёсцы працуе аптэка, дзе ёсць усе сродкі абароны і дэзінфекцыі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Брэсцкая вобласць.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Продавец	**ЗАО «МВЗ Интер»,** г. Минск, пр-т Партизанский, 8, к. 2/2, комн. 305

Предмет аукциона
Месторасположение – г. Минск, пр-т Партизанский, 8

№ п/п лота	Инв. №	Наименование предмета аукциона, год изготовления	Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС	Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС
1	442171	**Станок сверлильно-расточный с ЧПУ 24К40СФ4**	**5 640,00**	282,00
2	418187	**Станок резьбошлифовальный , модель 5822М,** 1975 г. в.	**2 640,00**	132,00
3	408102	**Вертикально-фрейзерный станок с ЧПУ 6т13ф3-1**	**4 440,00**	222,00
4	401326	**Токарный станок 16А20Ф3С15 С ЧПУ**	**7 800,00**	390,00
5	440846	**Станок вертикально-фрезерный 6М12П**	**2 760,00**	138,00
6	428233	**Пресс К2130в**	**2 520,00**	126,00
7	428229	**Пресс КР. КД2126 (Сальск)**	**2 280,00**	114,00
8	428214	**Пресс кривошипный КА 2126 (Сальск)**	**2 280,00**	114,00
9	428176	**Пресс кривошипный КА2330**	**7 080,00**	354,00
10	418225	**Станок шлифовальный 35131М**	**3 840,00**	192,00

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 19.00. Ответственное лицо: Короткевич Владимир Александрович, тел. +375 29 608-47-06

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: в день подписания договора купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 5 (пяти) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата, место и время проведения аукциона	**25.05.2020 в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата, место и время окончания приема документов	**22.05.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@ipmconsult.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Продавец	**ЗАО «МВЗ Фарбатек»,** г. Минск, пр-т Партизанский, д. 8, корп. 3, каб. 39, антресоль № 2

Предмет аукциона
Месторасположение – г. Минск, пр-т Партизанский, 8

№ п/п лота	Инв. №	Наименование предмета аукциона, год изготовления	Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС	Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС
1	428316	**Пресс ус.КД2330**	**7 080,00**	354,00
2	411250	**Станок вертикально-сверлильный 2Н118**	**3 120,00**	156,00
3	401189	**Станок токарно-винторезный 1К-62,** 1968 г. в.	**2 760,00**	138,00
4	401172	**Станок токарно-винторезный 1К-62,** 1965 г. в.	**2 760,00**	138,00
5	462314	**Кран-балка** (однобалочная, гр. 2 т)	**2 280,00**	114,00

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 19.00. Ответственное лицо: Короткевич Владимир Александрович, тел. +375 29 608-47-06

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638.

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: в день подписания договора купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 5 (пяти) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата, место и время проведения аукциона	**25.05.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата, место и время окончания приема документов	**22.05.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@ipmconsult.by

МЕМАРЫЯЛ У ГОНАР ЗЕМЛЯКОЎ

Зарэчча ўнікальнае ўжо тым, што гэтая маленькая вёсачка, якая паступова і няўмольна знікае з прычыны паважанага ўзросту сваіх жыхароў, раптам стала вёскай-мемарыялам. За нейкія пару гадоў тутэйшыя выхадцы-энтузіясты стварылі памятны комплекс у гонар землякоў — удзельнікаў вайны. Зусім нядаўна ўвайшла ў строй чарговая яго частка — капліца, дзе будуць праводзіцца памінальныя службы.

Фотаздымкі старога стэнда

Але пра ўсё па парадку. Самая маладая жыхарка Зарэчча Таісія Аляксандраўна Субота адзначыла 79-ы дзень нараджэння. Яна лічыцца старастай вёскі, у якой пастаянна жыве з дзясятак чалавек. Таісія Аляксандраўна вельмі ганарыцца тым, што ў іх з'явілася такое памятнае месца. Расказвае, як летам была ў доктара ў Пружанах, а назад вярталася на таксі: «Дык гэтаму хлопцу-кіроўцу сказала, каб далей праехаў, развярнуўся каля нашай галоўнай алеі — усё для таго, каб і ён убачыў яе. Таксіст так і зрабіў, і ўсе так робяць, хто сюды прыязджае. Тут нашы землякі на партрэтах, маладыя, прыгожыя».

Усяго з невялічкай пружанскай вёскі на вайну пайшлі 59 мужчын, 27 не вярнуліся. Цяпер іх партрэты ўтварылі галоўную мемарыяльную алею... А тыя, каму пашчасціла вярнуцца, у асноўным працавалі ў калгасе. У гаспадарцы і загінулых франтавікоў, і жывых удзельнікаў вайны заўсёды шанавалі. У свой час калгасны парторг сабраў па хатах фотаздымкі ўдзельнікаў вайны і размясціў іх на стэндзе пад назвай «Вечная слава героям».

Стэнд доўгі час вісеў у «чырвоным кутку» калгаснага двара, дзе збіраліся па святах. А потым многае змянілася, пачалася рэарганізацыя, былы калгасны двор прыйшоў у заняпад, фермы сталі закрываць, пабудовы — зносіць. Аднойчы выхадзец з гэтай вёскі Георгій Швед выпадкова

Міхаіл КУЦ *(злева)* і Георгій ШВЕД.

зайшоў у былы «чырвоны куток» і жахнуўся. Стэнд валяўся на падлозе, па ім хадзілі. Георгій Яраслававіч забраў тыя здымкі дадому. З гэтага і пачаўся невялікі музей, які ён абсталяваў у бацькоўскім доме.

Неаднойчы прыкідваў, як лепш увекавечыць памяць землякоў. На адным са свят вёскі падзяліўся сваімі думкамі з аднавяскоўцам Міхаілам Куцам.

Ад ідэі да бізнес-плана

— Мне тады яго словы адразу ў душу запалі, — кажа Міхаіл Міхайлавіч. — Я стаў меркаваць, раіцца з калегамі, сямейнікамі, як зрабіць, каб не знікла памяць пра людзей вёскі. Дзіўная рэч: чым больш жывеш і больш аддаляешся ад родных мясцін, тым болей сюды цягне.

Міхаіл Куц згадаў, як цяжка працавалі яго бацькі. Маці даяркай была, кароў уручную даіла, яму, хлапчуку, даводзілася не раз ёй дапамагаць. Нагледзеўшыся на такі лёс, Міхаіл і яго равеснікі імкнуліся хутчэй пакінуць вёску. Пасля заканчэння школы паступіў у ваеннае вучылішча, служыў па ўсім былым Саюзе, потым асеў у Брэсце, цяпер мае невялікі бізнес. Бацька Міхаіла Міхайлавіча таксама ваяваў, але, на шчасце, вярнуўся. І бацька жонкі франтавік. Так што для сям'і тэма Вялікай Айчыннай — асаблівая.

Бацькоў даўно няма, але на дзень вёскі заўсёды стараліся прыязджаць у Зарэчча. А калі аднойчы на свята Георгій Швед выставіў шчыт са здымкамі, якія ён падабраў на калгасным двары і рэстаўраваў, то людзі ад іх не адыходзілі. Многія пазнавалі сваіх сваякоў, суседзяў, плакалі, клікалі ўнукаў, паказвалі партрэты. Вось тады Куца нібы ахінула, у галаве ўзнікла карцінка з будучым мемарыялам. Ён і ўзяў на сябе львіную долю будучых расходаў.

Арка і капліца

Найперш былі выраблены мемарыяльныя дошкі з партрэтамі загінулых землякоў. Іх размясцілі ў выглядзе алеі, у канцы якой усталявалі памятны знак-арку са звонам. Справа ад аркі, як ужо гаварылася, узвялі капліцу. Яе купал, унутранае начынне падрыхтавалі ў Брэсце, а сюды прывезлі гатовыя кампаненты і змантіравалі.

З часам у Зарэччы маюць намер абсталяваць стаянку для машын. Паводле слоў прадпрымальніка, тут яшчэ будзе сквер з дрэвамі, у цэнтры паставяць некалькі сталоў, лаўкі, каб на тое ж свята вёскі можна было ўсім прысесці, пагаманіць, успомніць землякоў.

— На адкрыццё мемарыяла з'ехалася некалькі соцень выхадцаў з Зарэчча. Былі госці не толькі з розных гарадоў Беларусі, але і з краін замежжа, — расказвае **старшыня Велікасельскага сельскага Савета Таццяна НАВІЦКАЯ.** — Дачка франтавіка Івана Гука Вольга Ішчанка прыехала з Адэсы. Яе бацька загінуў у канцы зімы 1945-га. Волечцы тады быў толькі годзік. Пахаваны недзе ва Усходняй Прусіі. Вольга Ішчанка на адкрыцці сказала: «Пакуль жывая, буду сюды прыязджаць».

— Ну, цяпер па вядомых прычынах не можам дакладна сказаць, будзе летам дзень вёскі ці не, — працягвае кіраўнік мясцовай улады. — Але ж мемарыял мы падтрымліваем у парадку заўсёды, тэрыторыя прыбіраецца. У гэтым дапамагае Таісія Аляксандраўна Субота.

Каб жыла памяць

...Мы стаялі з Міхаілам Куцам і Георгіем Шведам каля першай мемарыяльнай дошкі на алеі. На ёй — партрэт Мікалая Гука. Пазначаны яго гады жыцця: 1926—1945. Салдат загінуў у студзені, цалкам верагодна, што да сваіх дзевятнаццаці ён не дажыў. Партрэт Мікалая паставілі першы нездарма: ён стаіць цяпер аккурат насупраць сваёй хаты, адкуль яго праводзілі на вайну. Прызыву падлягалі юнакі з 18 гадоў. Многія яго равеснікі, юныя, нявопытныя, гінулі першыя. Гэта значыць, не нарадзіліся іх дзеці, засталіся несуцешнымі маці.

Міхаіл Куц кажа: «Вёскі хутка не будзе як населенага пункта, але мы павінны захаваць яе для сябе, сваіх дзяцей, унукаў. Нехта ж і пасля нас абавязкова пройдзе-праедзе, нехта кветку пакладзе на 9 Мая. Пасля нас, спадзяюся, нашчадкі падхопяць эстафету, не забудуць сюды дарогу. Тыя з нас, чые бацькі і дзяды прыйшлі з вайны, у даўгу перад імі, такімі як Мікалай Гук».

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Пружанскі раён.



Памятная алея.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Продавец	**ЗАО «МВЗ Про»,** г. Минск, пр-т Партизанский, д. 8, корп. 2/2, пом. 402

Предмет аукциона
Месторасположение – г. Минск, пр-т Партизанский, 8

№ п/п лота	Инв. №	Наименование предмета аукциона, год изготовления	Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС	Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС
1	401308	**Гибкий модуль** (токарно-винторезный станок с ЧПУ 16А20ФЗ)	**7 920,00**	396,00
2	441748	**Станок плоскошлифовальный 3Г-71**	**4 320,00**	216,00
3	418127	**Станок круглошлифовальный 3А151,** 1964 г.в.	**5 760,00**	288,00
4	442183	**Обрабатывающий центр ОЦФ-1 с ЧПУ Bosch,** 1993 г.в.	**21 480,00**	1074,00
5	442184	**Обрабатывающий центр ОЦФ-1 с ЧПУ Bosch,** 1990 г.в.	**21 480,00**	1074,00
6	442181	**Обрабатывающий центр ЦР320 (Бишкек),** 1984 г.в.	**21 480,00**	1074,00
7	428337	**Пресс КД2124Е**	**4 800,00**	240,00
8	428283	**Пресс КД-2122,** 1978 г.в.	**3 960,00**	198,00
9	428419	**Пресс кривошипный КД-2122**	**3 000,00**	150,00
10	418125	**Станок внутришлифовальный 3А227,** 1963 г.в.	**6 480,00**	324,00
11	442495	**Станок точильно-шлифовальный ЗБ-634**	**1 056,00**	52,80
12	401335	**Универсальный токарно-винторезный станок 1604,** 1970 г.в.	**624,00**	31,20
13	443116	**Пресс гидравлический ДБ243,** 1953 г.в.	**13 320,00**	666,00
14	770860	**Прицеп «Купава» 813270**	**4 320,00**	216,00
15	401174	**Станок токарно-винторезный 1К-62,** 1966 г.в.	**1 680,00**	84,00
16	411232	**Станок вертикально-сверлильный 2Н118**	**1 560,00**	78,00
17	411253	**Станок вертикально-сверлильный 2Н118,** 1966 г.в.	**1 560,00**	78,00
18	411461	**Станок вертикально-сверлильный 2н135**	**1 800,00**	90,00
19	411430	**Станок агрегатно-сверлильный модель А6038П,** 1975 г.в.	**1 800,00**	90,00
20	411194	**Станок вертикально-сверлильный 2Н118**	**1 560,00**	78,00
21	411 03	**Станок вертикально-сверлильный 2Н118,** 1961 г.в.	**1 560,00**	78,00

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 19.00. Ответственное лицо: Короткевич Владимир Александрович, тел. +375 29 608-47-06

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: в день подписания договора купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 5 (пяти) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата, место и время проведения аукциона	**25.05.2020 в 13.30 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата, место и время окончания приема документов	**22.05.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@ipmconsult.by

КУПЛЮ МОТОБЛОК
или Минитрактор МТЗ,
можно в неисправном состоянии. **Тел. +375 29 666 00 70**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by **(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 23 красавіка 2020 года.**